

ЯК СПАЧУВАЦЬ БЛІЖНІМ 7

ВЕТРАКІ — ГЭТА ЭКАЛАГІЧНА 8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 КАСТРЫЧНІКА 2020 г. СЕРАДА № 205 (29319)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей РАЧКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:**

*«Сёння недастаткова быць проста кваліфікаваным спецыялістам, важна быць адданым сваёй краіне, абараняць беларускую дзяржаўнасць, якая нам далася вельмі нялёгка ў выніку развалу вялікай краіны, разрухі ў эканоміцы і адсутнасці дзяржаўных інстытутаў. Самаадданай працай некалькіх пакаленняў грамадзян Беларусі мы стварылі сваю дзяржаву, якую надзвычай важна берагчы, умацоўваць і развіваць».*

# АНТОН, АНТАНІНА І ІХ ГАСПАДАРКА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**З сям'ёй ПАНЦЯЛЕЕНКАЎ з вёскі Урбаны Браслаўскага раёна мяне звёў яго вялікасць выпадак. Цікавасць да маляўнічых ландшафтаў аднойчы спакусіла праехацца па крутагор'ях паміж азёраў Бужа і Саванар. А за вёскай Мякяны, якая знаходзіцца якраз у гэтых мясцінах, пачынаецца незвычайны сафары-парк з аленямі і статкам зуброў, а таксама і вальер з дзікімі жывёламі — насельнікамі беларускай прыроды. Гэтая тэрыторыя належыць Нацыянальнаму парку «Браслаўскія азёры». На ўчастку з вальерамі я і сустрэў сужэнцаў, папрасіў іх папазіраваць разам. Вядома, іх аднолькавыя імёны адразу падштурхнулі ўзяцца за фотаапарат, але не толькі — Антаніна і Антон калегі і нават дынастыя, бо працуюць разам, робяць адну справу — ён начальнік гэтай вялікай турыстычна-гульнявой гаспадаркі Нацыянальнага парка, яна ўсяго толькі рабочая па доглядзе за жывёламі — яго падначаленая. Пяць гадоў яны ў шлюбе, гадуюць дачку Аляксандру. Разам «гадуюць», калі так можна сказаць, і братоў нашых меншых — жывёл і птушак, якіх трымаюць у адмысловых клетках, адказваюць за іх здароўе, самаадчуванне, настрой і выгляд. Нядаўна вальер папоўніўся новым жыхаром, і ўся ўвага супрацоўнікаў скіравана на гэтую «асобу» — маленькую казулю *(яна — на фота)*. Гэтым здымкам пачынаецца сённяшні традыцыйны фотарэпартаж на 13-й старонцы «Звязды», ён — пра самы звычайны дзень даглядчыка і апекуна вальерных насельнікаў Нацыянальнага парка.**

СТАР. 13

## КОРАТКА

• **Рашэннем суда Цэнтральнага раёна Мінска інфармацыйны канал інтэрнэт-месенджара Telegram — NEXTA-Live і лагатып NEXTA прызнаныя экстрэмісцкімі матэрыяламі.**

• На тэрыторыі археалагічнага музея «Бярэсце» 24 кастрычніка разгорнецца інтэрактыўная пляцоўка «Замак Берасцейскі», прысвечаная жыццю горада ў XVII стагоддзі.

• **Людзі з абмежаванымі магчымасцямі шыюць ахоўныя маскі для магілёўскіх прадпрыемстваў.**

• Авіякампанія «Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў у Рыгу, Талін і Ларнаку да 14 лістапада.

• **Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Беларусі 23 кастрычніка выпусціць у абарачэнне паштовую марку «75-годдзе ААН».**

ISSN 1990 - 763X

### Арэнда жылля

## СТУДЭНЦКІ ПОПЫТ НА ЦЭНЫ АМАЛЬ НЕ ПАЎПЛЫВАЎ

### Спецыялісты адзначаюць: добра ящчэ, што рынак выжыў



**Так здарылася, што з прычыны пандэміі багатыя турысты ўжо не складалі ў жніўні-верасні канкурэнцыю нашым іншагароднім студэнтам і так званым «белым каўнерыкам», якія здымаюць жыллё ў буйным горадзе на зімовы час. Дык вось, сезон высокага попыту на арэнду кватэр у гэтым годзе аказаўся як ніколі кароткі і ўпершыню за апошнія пяць гадоў не прывёў да росту цэн, адзначаюць эксперты рынку жыллёвай нерухомасці Мінска.**

### СВАБОДНЫХ КВАТЭР СТАЛА БОЛЬШ У РАЗЫ

Гэты цяжкі год увойдзе ў гісторыю рынку арэнды кватэр як год з самым кароткім перыядам павышанага попыту. Толькі ў ліпені і жніўні частата запытаў аб пошуку здымнага жылля знаходзілася на ўзроўні, які можна назваць высокім. Ужо з сярэдзіны верасня попыт на арэнднае жыллё зноў упаў ніжэй за сярэдняе шматгадовае значэнне, апусціўшыся за месяц у параўнанні са жніўнем на 27 %. Як адзначаюць аналітыкі рынку, у мінулыя гады попыт заставаўся высокі з пачатку лета і аж да сярэдзіны восені — дзесьці да 20-х чысла ў кастрычніка.

СТАР.4

### Прыкмету часу

## Ловіцца рыбка вялікая і малая

### Махляры паспяхова выкарыстоўваюць інфармацыйныя тэхналогіі, а людзі па-ранейшаму праяўляюць неабачлівасць

**Падзеі разварочваліся хутка, нібы ў дэтэктыўным рамане. На тэлефон 59-гадовай жыхаркі райцэнтра патэлефанавалі а палове сёмай вечара. Малады чалавек прадставіўся супрацоўнікам банка, назваў свой асабісты код, звярнуўся да жанчыны па імені і па бацьку, строгім голасам паведаміў, што з яе банкаўскай карткі ажыццяўляюцца спробы спісання грошай. «Банкаўскі работнік» даводзіў, што калі сама яна гэтых маніпуляцый не здзяйсняла, трэба тэрмінова заблакаваць картку. Для гэтага яму патрэбныя нумар і код плацежнага сродку, каб лішні раз упэўніцца, што ён размаўляе менавіта з трымальнікам названай карткі.**

### ФІШЫНГ — НОВАЯ ЗБРОЯ МАХЛЯРОЎ

Ён гаварыў хутка, не даючы ёй уставіць слова, падкрэсліваў, што ў гэтай справе важна не ўпусціць час, бо зламыснікі не дрэмлюць... І жанчына назвала рэквізіты банкаўскай карткі. А пазней убачыла, што з карткі было спісана 3800 рублёў. Усё правільна ён гаварыў наконт спробы спісання — бо сам гэтым займаўся. Ды спроба скончылася гэтым толькі пасля таго, як жанчына ўказала доступ да сваёй карткі.

СТАР. 5

З першых вуснаў

# «ЧАС ПАТРАБУЕ НАДЗЕЙНЫХ ЛЮДЗЕЙ, УПЭЎНЕНЫХ І АДДАНЫХ САВЁЙ ДЗЯРЖАВЕ»

## Прэзідэнт назначыў свайго памочніка, кіраўніка Апарату Саўміна і ўзгадніў намесніка міністра, кіраўнікоў райвыканкамаў і ВНУ

**Леанід Мартынюк стаў памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Магілёўскай вобласці. Канстанцін Бурак назначаны кіраўніком Апарату Савета Міністраў, Андрэй Еўдачэнка — пастаянным прадстаўніком Беларусі ў Арганізацыі па забароне хімічнай зброі па сумяшчальніцтве, а Максім Ермаловіч — пастаянным прадстаўніком Беларусі пры Міжнароднай марской арганізацыі па сумяшчальніцтве.**



Фота БелТА.

Старшынямі Бярозаўскага і Ляхавіцкага райвыканкамаў адпаведна ўзгоднены Сяргей Барташ і Мікалай Мароз. Прэзідэнт даў згоду на прызначэнне на пасаду намесніка міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандра Гарошку. Таксама ўзгоднены кіраўнікі трох ВНУ. Наталля Карчэўская стане рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, Наталля Лапцева — рэктарам Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, а Аляксандр Бахановіч узначаліць Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт.

Андрэй Сайко з пасады намесніка старшыні Беларускага дзяржаўнага канцэрна па нафце і хіміі пяройдзе генеральным дырэктарам у ААТ «Нафтан».

### Прыватызацыю не разглядаем

Прадстаўляючы Андрэя Сайко, адзначылі, што ён ідзе на новую работу ў «Нафтан» з жаданнем. Прэзідэнт пагадзіўся, што гэта найбольш важна.

«Галоўнае, каб у яго было жаданне, таму што пасада ў яго для 40 гадоў несалодкая. Прадпрыемства вельмі складанае, мадэрнізацыя, я спадзяюся, заканчваецца. Вы адказваеце за гэта і па старой сваёй рабоце, паколькі працавалі фактычна ў міністэрстве і мелі дачыненне да мадэрнізацыі гэтага прадпрыемства. А зараз, будучы генеральным дырэктарам, тым больш», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, вельмі добра, што маладыя прыходзяць на вядучыя пасады. Курс на амаладжэнне кіруючых кадраў узяты даўно.

«Камусьці вочы засланіла, і яны гэтага не бачаць. Думаюць, што можна адразу са школы пайсці кіраваць прадпрыемствам. Ды не, трэба патаптацца добра на жыцці, як тыя, хто прысутнічае тут. Тады будзе карысць. А патаптацца па чыстых, утульных мінскіх вуліцах і думаць пра тое, што «заўтра я вазьму кіраўніцтва не толькі прадпрыемствам, але і краінай у сваe рукі», — гэта, па меншай меры, небяспечная, памылковая думка», — дадаў Аляксандр Лукашэнка, але сказаў, што амбіцыі — рэч нядрэнная.

Ён яшчэ раз нагадаў, што «Нафтан» — прадпрыемства складанае, на якое пазіраюць карупцыянеры.

«Прадпрыемства такое, на якое часта паглядаюць карупцыянеры, рознага кшталту зладзеі і тыя, хто жадае прыватызаваць прадпрыемства, пажадана за бясцэнак. Іх вакол топчацца мора. Вы павінны ведаць маю прынцыповую пазіцыю: ***мы сёння нават не разглядаем пытанне прыватызацыі нафтаперапрацоўчых заводаў***, як бы ні было зараз складана на рынку», — падкрэсліў Прэзідэнт і нагадаў, што ў гэты крызісны час мы павінны шукаць шляхі, якія выведуць на нармальны трэнд развіцця.

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што «Нафтан» — горадаўтваральнае прадпрыемства, таму зона адказнасці гендырэктара не заканчваецца тэрыторыяй завода, і нагадаў пра падтрымку неабароненых катэгорый насельніцтва. «Нельга людзей кідаць, мы ж славяне, павінны па-чалавечы жыць. Калі ты чагосьці дасягнуў, дапамажы суседу. Не крыўдзіце людзей. У большасці ў нас добрыя людзі. Беларусы — людзі добрыя, з мазгамі», — упэўнены Прэзідэнт.

Ён акцэнтаваў увагу, што да падбору новых кіруючых кадраў падыходзілі ўважліва: ***«Час патрабуе не толькі добрых прафесіяналаў. Сёння час патрабуе надзейных людзей, упэўненых і адданых сваёй дзяржаве, каб нас не парвалі на кавалкі і не падзялілі».***

Прэзідэнт адзначыў: «некаторым ужо не кавалак Беларусі, а ўся Беларусь патрэбна».

«А мы навошта, дзе мы тады будзем? Гэта асаблівасць — мы ніколі не думалі, што нам, гаспадарнікам, прыйдзецца несці на сабе залішнюю ідэалагічную нагрузку. Аказалася, ***трэба ідэалогіяй займацца, трэба працаваць з людзьмі, трэба ім паказваць, што адбываецца»,*** — канстатаваў кіраўнік краіны.

Ён дадаў, што асаблівa гэта тэма актуальна для Мінска. Жыццё ў сталіцы і ў глыбінцы адрозніваецца: у рэгіёнах людзі працуюць. «А хтосьці, іх меншасць, не разумее, што такое дзяржава, як мы рашуча будзем падтрымліваць гэту дзяржаву», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Ён абурыўся, што пратэстоўцы «бадзяюцца» па вуліцах і паводзяць сябе нахабна. «Мы змянілі тактыку. Правільна сказаў кіраўнік упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю. Мы ў спакойным рэжыме знойдзем кожнага. Сучасныя сродкі дазваляюць гэта рабіць, што мы і робім. І кожны адкажа за свае дзеянні. Я тут не пагражаю, мы ў гэтым кірунку працуем, і гэта дае пэўны эфект», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што людзі сталі больш відушчыя і ўбачылі, «хто рвецца да ўлады, хто можа прыйсці да ўлады і што будзе з краінай». «Кажуць мінчане ў сродках масавай інфармацыі: не заснуць па вечарах, па начах, баяцца дзяцей вывесці на вуліцу і гэтак далей. Людзі ўбачылі, што могуць страціць, і ***паранялі спакойны Мінск і Мінск, які віруе, няхай толькі і па нядзелях»,*** — выказаўся Прэзідэнт.

«Некаторыя людзі не разумеюць, што Прэзідэнт не ляпае проста так языком, як некаторыя там думаюць. ***Сказана, што краіну не аддадзім — значыць не аддадзім. І вырашаць будзе ў Беларусі, пакуль я Прэзідэнт, беларускі народ. Толькі людзі будуць вырашаць.*** Ні Прэзідэнт у адзіночку, ні кіраўнік Адміністрацыі, вышэйшыя службовыя асобы, ні дэпутаты не будуць рашаць у адзіночку, а прынясуць народу і скажуць — рашыце 10—20—30 пытанняў. Як народ вырашыць, так і будзе», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Ён сцвярджае: не трэба думаць, што ўлады нешта «змудрагеляць з Канстытуцыяй і зробяць новую праз падман».

«Калі народ захоча нешта іншае, чым той курс, па якім ішлі, няхай паспрабуюць. Бо глыбінная прычына ў чым (як нам украінцы, расіяне падказваюць) — у Беларусі народ «непалоханы». Гэта цытата: яны не жылі ў горшых умовах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### Іншадумства не блытаць з парушэннем закона

Прэзідэнт у размове з рэктарамі назваў «не нашай палітыкай» рабіць выгляд, што ва ўніверсітэтах нічога не адбываецца. Па яго словах, ён ведае ўсе праблемы, але катастрофы няма. «Студэнты заўсёды былі людзьмі бурнымі і бурлівымі. І мне часта кажуць: «Што вы церпіце гэтых студэнтаў? Ды павыганяць іх, і іншае». Але тут і асабістае. Я ўспамінаю сябе, калі быў студэнтам. Ведаеце, дэкану гістарычнага факультэта заўсёды было са мной няпроста. Але я ніколі не ваяваў супраць улады, — падкрэсліў Прэзідэнт. — З дэканам я заўсёды ваяваў за сумленнасць».

Прэзідэнт адзначыў, што новым рэктарам прыйдзецца наводзіць парадак у іх універсітэтах, таму калі яму прапанавалі на дзве пасады жанчын, сумняваўся, а потым вырашыў: «Жанчыны хутчэй з беспарадкамі разбяруцца, чым мужыкі. Вы ведаеце, што я жаночы Прэзідэнт. Мяне заўсёды жанчыны падтрымлівалі».

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што гатовы па закліку прыехаць у любую ВНУ і разам з рэктарам размаўляць са студэнтамі.

«Ёсць нямала студэнтаў, якія заблыталіся, выскачылі. Ёсць тыя, у каго мазгі на месца ўжо не паставіш. Але іх адзінкі. За імі цягнуцца і іншыя: «Ён выйшаў, супраць улады выступіў, я за ім». Я гэта ўсё ў душы разумею, і супакойваў і сілавікоў, і чыноўнікаў — трэба вытрываць. Зразумеюць людзі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён звярнуўся праз рэктараў і да студэнтаў. ***«Тут не пытанне, што мы змагаемся з іншадумствам. Розныя павінны быць погляды,*** — сказаў Прэзідэнт. — Мы не супраць гэтага змагаемся, змагаемся супраць парушэння закона. Яны парушаюць закон. Нікога не ўгаворвалі. Прыйшлі, патлумачылі. Такі парадак: хочаце вучыцца — вучыцеся. Не хочаце — рабяты, сыходзьце лепш самі».

Прэзідэнт адзначыў, што час няпросты, і на Усебеларускім народным сходзе ён раскажа дэталі таго, што адбываецца і мае адбыцца. «Трэба гэты час перажыць. Горш будзе, калі мы перажывём, як перажыла Украіна, а яшчэ жахлівей, як Карабах», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

### Каментарый у тэму

**Леанід МАРТЫНЮК, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці:** «Задачы, якія пастаўлены і будуць выконваца не толькі мною, але і ўсёй камандай Адміністрацыі Прэзідэнта, — гэта падтрыманне і паскарэнне развіцця ўсяго сельскагаспадарчага і вытворчага комплексу. Магілёўская вобласць з'яўляецца ўнікальнай з пункту гледжання сімбіёзу вёскі і прамысловасці. На сённяшні дзень мэты — загрузка ўсіх вытворчых магутнасцяў і павелічэнне вытворчасці ў выніку, каб павялічваліся заробкі і паляпшаўся дабрабыт людзей».

**Андрэй САЙКО, генеральны дырэктар ААТ «Нафтан»**, расказаў, што будаўніча-мантажныя работы па мадэрнізацыі прадпрыемства будуць скончаны ў красавіку будучага года: «Я курыраваў некаторыя іншыя работы ў канцэрне. Але я ведаю пра праект, пра яго значнасць для прадпрыемства, ведаю, на якой стадыі ён знаходзіцца. Задачы, якія сёння Прэзідэнт агучыў, — гэта найхутчэйшыя тэрміны завяршэння рэалізацыі будаўніцтва ўстаноўкі».

**Наталля ЛАПЦЕВА, рэктар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта:** «Той факт, што студэнты Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта ў большай ступені сёння выяўляюць актыўнасць, магчыма, звязана з тым, што яны вывучаюць розныя мовы, культуры, глядзяць на вопыт многіх дзяржаў. Разам з тым мы мяркуем, што палітычная культура дапаможа, дапамагала і будзе дапамагаць прымаць заўсёды ўзважаныя рашэнні, вызначаць сваю пазіцыю, грунтуючыся на веданні гісторыі, вопыце. Развіццё палітычнай культуры стане адной з ключавых задач».

Ва ўрадзе

# Чатыры задачы для эканомікі

**Асноўныя індыкатары пры дапрацоўцы прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі — павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва, стымуляванне дзелавой і інвестыцыйнай актыўнасці. Пра гэта прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА заявіў учора на пасяджэнні Савета Міністраў, дзе абмяркоўваліся праекты прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі і рэспубліканскага бюджэту на 2021 год.**

Па яго словах, 2021 год — год аднаўленчага росту эканомікі, запуску новага інвестыцыйнага цыкла, таму галоўнае — за кошт якіх рэсурсаў эканамічнай палітыкі будзе забяспечвацца прагнозны параметр інвестыцый. «Без росту інвестыцый у асноўны капітал эканамічны рост апераджальнымі тэмпамі для нашай краіны немагчымы», — сказаў прэм'ер.

Асноўныя параметры дзяржаўнага бюджэту 2021 года і прапановы па карэкціроўцы Падатковага кодэкса ўжо разгледжаны, таму кіраўнік урада папрасіў далажыць, як выканаць даручэнні па ўрэгуляванні спрэчных момантаў.

Сярод іх — пытанні акцызнай палітыкі на тытунь, аптымізацыі льгот па падатку на дабаўленую вартасць, а таксама аб'ёмы расходаў бюджэту, звязаных з эпідэміялагічнай сітуацыяй.

«Бюджэт будучага года фарміруецца ва ўмовах нестабільнай эканамічнай кан'юнктуры. Магчымасці бюджэтнага стымулявання значна абмежаваны з улікам неабходнасці выканання ўсіх сацыяльных абавязкаў дзяржавы і своечасовага пагашэння і абслугоўвання дзяржаўнага доўгу. Таму лабістам дадатковых расходных абавязкаў бюджэту неабходна мець рэальныя прапановы па адпаведных крыніцах даходаў», — перадае словы Рамана Галоўчанкі прэс-служба ўрада.

Перад пасяджэннем **міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ** расказаў журналістам, што для сацыяльнай стабільнасці, росту дабрабыту насельніцтва падрыхтавалі праект указа, які складаецца з двух блокаў — сацыяльнага і эканамічнага. «Першы з чатырох ключавых кірункаў сацыяльнага блока звязаны з даходамі насельніцтва. Стаіць задача забяспечыць прырост даходаў насельніцтва больш чым на 7 % у намінальным выражэнні», — паведаміў Аляксандр Чарвякоў.

Другая задача — не дапусціць росту цэн на сацыяльна значныя тавары вышэй за ўзровень інфляцыі. Трэці кірунак — узровень беспрацоўя не павінен перавысіць 4,4 %. Чацвёртая задача — пабудаваць у 2021 годзе каля чатырох мільёнаў «квадратаў» жылля, прыблізна чвэрць з іх — з дзяржпадтрымкай.

Марыя ДАДАЛКА.

Сугучча

# Духоўныя каштоўнасці: погляд Азіі і Еўропы

**Казахстанскі нацыянальны педагагічны ўніверсітэт імя Абая правёў анлайн-канферэнцыю «Духоўныя каштоўнасці як асновы фундамента культуры нарадаў». Да ўдзелу ў шырокай дыскусіі па розных гуманітарных пытаннях далучыліся Беларусь і яшчэ пяць краін — Узбекістан, Азербайджан, Таджыкістан, Расія, Турцыя.**

Хацелася б заўважыць, што ва ўніверсітэце працуюць дзве важныя кафедры — кафедра Асамблеі народа Казахстана і кафедра ўсходняй філалогіі і перакладу. Да таго ж ВНУ па праве трымае пальму першынства ў многіх гуманітарных, культуралагічных, літаратуразнаўчых даследаваннях. Таму зусім невыпадковай падаецца міжнародная ўвага да здабыткаў вучоных, выкладчыкаў КазНПУ ў розных аспектах навуковай, асветніцкай дзейнасці.

Удзел у анлайн-канферэнцыі прынялі кандыдат гістарычных навук, доктар палітычных навук Жамарт СІМЦІКАЎ (ён выступіў з дакладам «Заснавальнікі духоўнай каштоўнасці Усходняга Рэнесансу»), кандыдат філалагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Калмыцкага навуковага цэнтра Расійскай акадэміі навук Рыма ХАНІНАВА («Калмыцка-беларускія літаратурныя сувязі»), загадчык аддзела міжнародных сувязяў і сусветнай літаратуры Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. А. Ауэзава, кандыдат філалагічных навук Святлана АНАНЬЕВА («Еўразійства як кантрапункт сучаснай прозы»), іншыя вучоныя, грамадскія дзеячы.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Блізкая ўлада

# ПРА ЖЫЛЛЁ: ХУТЧЭЙ І ТАННЕЙ!

**Тыя, хто мае льготы пры будаўніцтве жылля, чакаюць ад дзяржавы, каб іх забяспечылі «метрамі» як мага хутчэй і па даступнай цане. Але як гэта зрабіць? — такое заўсёды актуальнае пытанне абмяркоўвалася нядаўна на пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама.**

Пастановай Савета Міністраў на бягучы год даведзена заданне па агульным уводзе ў эксплуатацыю жылых дамоў, пабудаваных з дзяржаўнай падтрымкай, — плошчай больш за 66 тысяч «квадратаў», па забеспячэнні жыллём 748 шматдзетных сем'яў. А ўсяго запланавана пабудаваць 335 тысяч квадратных метраў. За студзень—чэрвень ключы атрымалі 483 шматдзетныя сям'і — 64,6 % ад гадавога задання. Накіравалі дакументы на будаўніцтва для 787.

На жаль, даўгабуды яшчэ не сталі часткай гісторыі. У Полацкім і Мёрскім раёнах, а таксама ў Віцебску будуюць дамы, своечасовая здача якіх знаходзіцца пад пагрозай.

Забеспячэнне жыллём усіх, хто мае ў гэтым патрэбу, — адзін з галоўных прыярытэтаў мясцовай улады. Гэтыя словы прагучалі ў час гутаркі пра кватэры і катэджы. І разам з тым жыллё павінна быць людзям па кішэні.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў даў адказныя даручэнні. У прыватнасці, запатрабаваў прааналізаваць: што можна зрабіць, каб жыллё патаннела. Напрыклад, параіў вывучыць досвед тых, хто вырабляе ў Прыдзвінні зборныя дамы на экспарт у Расію. Кошт метра ў такіх «хатках» з усімі ўмовамі ў разы ніжэйшы! У чым загадка? Разбяруцца спецыялісты і чыноўнікі.

На поўначы краіны кошт квадратнага метра жылля, якое будуецца з дзяржаўнай падтрымкай, — 1093 рублі (даныя па выніках першага паўгоддзя). Гэта, дарэчы, больш, чым устаноўлены ўрадам паказчык. Што цікава: калі жыллё будуецца ў абласным цэнтры, гэта зусім не значыць, што яно будзе значна даражэйшае, чым у правінцыі. Напрыклад, «квадрат» у Шаркаўшчыне ў дамах буйнапанельнага будаўніцтва каштуе больш за 1410 рублёў. А ў Віцебску ад мясцовага домабудаўнічага камбіната — каля 1000 рублёў...

Кіраўнікі абласной вертыкалі выканаўчай улады патрабуюць ад заказчыкаў будаўніцтва, праектных арганізацый, тых, хто вырабляе канструкцыі буйнапанельнага домабудаўніцтва, перагледзець палітыку цэн. А для гэтага трэба прааналізаваць выдаткі і іншыя паказчыкі.

Актуальным застаецца дэфіцыт сродкаў на праектаванне і будаўніцтва аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктур. У прыватнасці, з-за праблем з фінансаваннем у гэтым кірунку (больш чым 2,5 млн рублёў) могуць быць са спазненнем здадзены пад ключ аж пяць дамоў у віцебскім мікрараёне Білева.

Акрамя таго, на працяглым кантролі Адміністрацыі Прэзідэнта, Камітэта дзяржаўнага кантролю знаходзяцца звароты грамадзян наконт забеспячэння неабходнай мінімальнай інжынернай інфраструктурай раёнаў індывідуальнай жылой забудовы. Гэта таксама патрабуе выдзялення сродкаў. Сёлета ў цэлым не хапае 26,5 мільёна рублёў.

Што да арэнднага жылля, на Віцебшчыне, як і ў цэлым па краіне, яно будуецца пераважна за кошт мясцовых бюджэтаў. Выкарыстоўваюцца і сродкі ад здачы ў арэнду ўжо пабудаваных кватэр. І аб'ём сродкаў вельмі абмежаваны. У выніку попыт на арэнднае жыллё, мякка кажучы, не задавальняецца ў поўнай меры. Каб неяк актывізаваць вырашэнне праблемы, раённымі і гарадскімі выканкамамі прымаюцца меры для будаўніцтва арэнднага жылля шляхам прыцягнення сродкаў прадпрыемстваў. Але і гэтага недастаткова.

Вобласці даведзена заданне па будаўніцтве арэнднага жылля ў памеры 11,8 тысячы «квадратаў». У тым ліку — 9,5 тысячы — за бюджэтныя грошы і грошы ад здачы, 2,3 тысячы — укладанне прадпрыемстваў. Апошнія павінны больш актыўна будаваць «арэнду» для работнікаў, бо гэта прадугледжваецца Дырэктывай Прэзідэнта № 8 «Аб прыярытэтных кірунках развіцця будаўнічай галіны».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

На слыху

# Фэйкавыя зборы

## Паведамленне ад Мінабароны аказалася несапраўдным

Учора ваеннаабавязаныя пачалі атрымліваць на электронныя скрыні паведамленне ад імя Мінабароны, дзе было сказана прыбыць у чацвер у ваенкаматы па месцы жыхарства з пакетам дакументаў (ваенным білетам, пашпартам і нават вадзіцельскім пасведчаннем) для атрымання мабілізацыйнага прадпісання. Зразумела, усё гэта выклікала пэўны рэзананс.

Трывога аказалася беспадстаўнай, паколькі «паведамленне аб яўцы ў ваенкамат, якое рассылаецца ад імя ваеннага ведамства, з'яўляецца фэйкам». Такую інфармацыю Міністэрства абароны размясціла ў сваім Telegram-канале.

«Паведамленне аб яўцы ў ваенкамат, якое рассылаецца па электроннай пошце (з адраса info.mil.by@yandex.by) ад імя ваеннага ведамства, не з'яўляецца сапраўдным. Адрас не належыць ваеннаму ведамству. Абавязкі грамадзян па выкананні вайсковага абавязку выкладзены ў законе «Аб вайсковым абавязку і вайсковай службе», а не ў законе, згаданым у фэйкавым паведамленні», — адзначылі ў Мінабароны.

У мэтах выканання воінскага абавязку грамадзян выклікаюць у ваенны камісарыят або іншы орган, які ажыццяўляе вайсковы ўлік, толькі персанальнымі павесткамі, у якіх паказваецца не тэлефон даверу дзяржорганаў, а тэлефон службовай асобы органа, які выклікае грамадзяніна. «Калі ў вас узнікаюць пытанні, калі ласка, звяртайцеся па растлумачэнне ў ваенкамат па месцы жыхарства», — дадалі ў ведамстве.

Прырода і мы

# ДА ВАС ГАГА НЕ ЗАЛЯТАЛА?

## У пік асенніх міграцый арнітолагі фіксуюць рэдкіх для Беларусі вадаплаўных птушак

**Выпадкі, калі гагі падчас пералётаў завітваюць у Беларусь, вельмі рэдкія. Упершыню марскую качку зарэгістравалі ў лютым 1983 года на возеры Лукомльскім. З 1997 года адзначаліся адзінкавыя сустрэчы з гагамі ў наваколлях Мінска і Жодзіна, заўсёды з лютага па красавік. Зараз гэтая птушка нечакана з'явілася на Заслаўскім вадасховішчы ўвосень.**



Звычайная гага — даволі вялікая качка. Яна выводзіць птушанят на ўзбярэжжы Паўночнага Ледавітага акіяна. Зімаваць можа ў Партугаліі, Венгрыі, Румыніі, краінах былой Югаславіі, Албаніі, Грэцыі, Балгарыі, Турцыі.

Калі мы з арнітолагам Мікалаем Вараб'ём прыехалі на Заслаўскае вадасховішча, гага плавала не надта далёка ад берага. Бачна было, што птушка стамілася на нялёгкім, поўным небяспек шляху ў вырай. Дзьмуў па-зімоваму халодны вецер, гага пагойдвалася на неспакойных хвалях.

Яшчэ на вадзе плавала сям'я лебедзяў-шыпуноў з пяцю шэрымі птушанятамі-падлеткамі. Чорнымі ценямі праляталі бакланы і сядалі на дрэвы. З супрацьлеглага берага ўзняліся тры белыя чаплі. У аб'ектыў Мікалая трапіла чарада чубатых ныркоў.

Здавалася, гагу ніколькі не турбавала прысутнасць «суседзяў». Мы мелі магчымасць добра разгледзець яе ў бінокль. У самца гагі пер'е чорна-белае, кантрастнае, а самка меншая за яго, і афарбоўка ў яе сціплая — карычневая з чорнымі плямкамі і рысачкамі на пёрах.

На вадасховішчы Дразды зафіксаваны яшчэ два рэдкія ў нашых краях віды вадаплаўных — нырок-плёсачка (рус. морская чернеть) і чырвонаваллёвы гагач (рус. краснозобая гагара).

**Святлана ІШЧАНКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Аўстраліі зафіксавалі рэкордную актыўнасць замежных шпіёнаў



Маштабы шпіёнскай дзейнасці ў Аўстраліі на цяперашні момант пераўзыходзяць тыя, што назіраліся падчас «халоднай вайны», заявіў кіраўнік аўстралійскай Службы бяспекі і разведкі Майкл Берджэс. Ён таксама папярэдзіў, што за замежнымі дыяспарамі, якія пражываюць на тэрыторыі Аўстраліі, сочаць замежныя ўрады і прымаюць меры супраць членаў гэтых супольнасцяў. Пры гэтым Берджэс назваў падобныя дзеянні «нічым іншым, як атакай на аўстралійскі суверэнітэт». Паводле яго заявы, варожыя дзеянні часам выклікаюць толькі тым, што прадстаўнікі гэтых дыяспар выступаюць за дэмакратычныя рэформы ці асуджаюць парушэнні правоў чалавека. Таксама Берджэс заўважыў, што замежныя разведкі ў якасці прыярытэтных мэт выбіраюць аўстралійскіх палітыкаў рознага ўзроўню для прасоўвання сваіх інтарэсаў, маніпуляцый з працэсам прыняцця рашэнняў і крадзяжу сакрэтаў.

### З турмы ў Конга збегла больш за 900 злачынцаў і тэрарыстаў



Больш за 900 зняволеных, уключаючы небяспечных злачынцаў і тэрарыстаў, было вызвалена з цэнтральнай турмы горада Бені на ўсходзе Дэмакратычнай Рэспублікі Конга баевікамі тэрарыстычнай групоўкі «Альянс дэмакратычных сіл», паведаміў партал навін Actualite. «Баевікі атакавалі турму Кангбаі і аднačасова размешчаны побач з ёй армейскі лагер», — расказаў выконваючы абавязкі мэра горада Бені Мадэст Бакванамаха. Ён растлумачыў, што злачынцы з групоўкі прарваліся на тэрыторыю турмы, адкрылі ўсе камеры і выпусцілі зняволеных. Усяго ў турме горада ўтрымлівалася больш за тысячу асуджаных, з якіх толькі 110 адмовіліся бегчы і засталіся на месцы. Партал Actualite адзначыў, што гэта не першы выпадак, калі пры нападзе на цэнтральную турму Бені з яе вызваляюць вязняў. Напрыклад, летам 2017 года баевікі з руху «Май-май» выпусцілі з яе 930 зняволеных, яшчэ 11 чалавек былі забітыя.

### У Перу знайшлі гіганцкую двухтысячагадовую кошку



Археолагі выявілі гіганцкую выяву кошкі падчас раскопак на тэрыторыі плато Наска ў паўднёвай частцы Перу. У даўжыню геогліф дасягае 37 метраў, яго ўзрост — больш за дзве тысячы гадоў. Мяркуючы па малюнку, жывёла «ляжыць» на схіле гары на левым баку. Выяву заўважылі падчас работ па рэстаўрацыі назіральнай пляцоўкі, якая знаходзілася пад пагрозай знікнення з-за натуральнай эрозіі, паведамілі ў міністэрстве культуры Перу. Па стылістычных асаблівасцях малюнак адносіцца да гістарычнага перыяду Паракас, калі выявы кацяных былі папулярныя ў мясцовай культуры. Ён стаў найстаражытнейшым з малюнкаў плато Наска, большасць з якіх датуюцца 100—200 гадамі да нашай эры. Як вядома, тутэйшыя ўнікальныя геогліфы ўключаны ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. На плато, якое расцягнулася на некалькі дзясяткаў кіламетраў, можна ўбачыць гіганцкія выявы людзей, жывёл, раслін і розных геаметрычных фігур.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Турчыну Аляксандру Генрыхавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# СТУДЭНЦКІ ПОПЫТ НА ЦЭНЫ АМАЛЬ НЕ ПАЎПЛЫВАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Прапанова кватэр на фоне нізкай актыўнасці арандатараў чарговы раз вырасла. Іх агульная колькасць у базе ў верасні перавысіла жнівеньскі ўзровень на 8,5 %. Але мацней за ўсё змяніўся аб'ём прапановы кватэр на рынку доўгатэрміновай арэнды ў параўнанні са студзенем-лютым гэтага года. Менавіта дзесяць з пачатку года ў нашай краіне пачаў «прасядаць» рынак пасутачнай арэнды. За гэты час колькасць кватэр на «доўгатэрміноўцы» ўзрасла з трох тысяч амаль да шасці тысяч аб'ектаў. Спецыялісты лічаць, што лішак кватэр на доўгатэрміновай арэндзе будзе назірацца яшчэ даволі працяглы час, аж да поўнай перамогі чалавецтва над злым вірусам.

## БЮДЖЭТНЫЯ АДНАПАКАЁЎКІ — ПАЧЫНАЮЧЫ З 200 ДОЛАРАЎ

Вядома, апошнія падзеі паўплывалі на працу агенцтваў нерухомасці, але пры гэтым трэба разумець, што традыцыйны студэнцкі ажыятаж нікуды не дзеўся. Маладыя людзі і цяпер арганізуюцца ў «студэнцкія» камуналкі, дзе двухпакаёвую кватэру здымаюць па двое-трое чалавек. «У складчыну» студэнты здымаюць нават аднапакаёвыя кватэры.

Дык вось, самыя танныя малыя кватэры прапануюцца за 200–210 долараў плюс аплата камунальных паслуг. Дарэчы, трэба разумець, што па такім кошце прапануецца жыллё, якое трохі адрозніваецца ад стандартнага. Гэта будзе кватэра на нізкім першым паверсе, або меса ў загазаваным раёне. Адмоўнай характарыстыкай арэнднага жылля стане і не зусім зручнае яго размяшчэнне (пяць-шэсць прыпынкаў ад другой лініі метро), старая мэбля, няякасная сантэхніка і халодныя сцены. Калі першапачаткова вам прапануюць досыць танную кватэру, нягледзячы на яе якаснае начынне, варта адразу цікавіцца, хто там прапісаны. Пры ўмове, што там ніхто не прапісаны, плаціць за камунальныя паслугі ў ацяпляльны сезон прыйдзецца значна больш (у два, тры разы).

Калі кватэра сапраўды маленечкая, а да таго ж у ёй адсутнічае мэбля, тады яна можа здавацца і за 190 долараў у месяц. Але гэта хутчэй выключэнне, чым правіла.

Існуюць у сталічных агенцтваў нерухомасці больш ліквідныя кватэры. Ніжні цэннік такога жылля пачынаецца з 220–230 долараў. А цалкам «нафаршыраваныя» бытавой тэхнікай і свежай мэбляй кватэры будуць каштаваць у месяц каля 240–260 долараў. Сярэдні цэннік аднапакаёвых кватэр роўны 244 доларам.

## ДВУХПАКАЁВЫЯ — НЕ НАШМАТ ДАРАЖЭЙШЫЯ

Афіцыйны сярэдні цэннік гэтых кватэр роўны 288 доларам. Мінімальная цана бюджэтнай «двушкі» пачынаецца з 210 долараў. Менавіта столькі каштуе арэнда двухпакаёвай «хрушчоўкі» з прахаднымі пакоямі. Знаходзіцца такая кватэра на крайніх паверхах старога пяціпавярховага дома. Большасць сярэдніх па якасці кватэр гэтага класа (з прымальнай мэбляй і пральнай машынай) падпадаюць у цэнавы дыяпазон ад 240 да 270 долараў, але...

Менавіта вялікая колькасць двухпакаёвых кватэр перайшла з класіфікацыі сутачных у ранг доўгатэрміновай арэнды. Гэтае жыллё не заўсёды з ідэальным рамонтам, але ў асноўным з прапіскай бліжэй да цэнтра горада. А ў цэнтры мегаполіса цэннік на здымнае жыллё ўжо значна вышэйшы. Так што ў апошні час невялікую і не вельмі дарагую кватэру студэнты могуць адшукаць і недалёка ад будынка свайго ўніверсітэта.

Цяпер на рынку дастаткова кватэр з элітным рамонтам і з павышаным цэннікам. А пры залішняй канкурэнцыі, як вядома, цэны нязменна зніжаюцца. Двухпакаёвыя кватэры па цане больш за 400 долараў ужо на працягу двух-трох месяцаў працягваюць з невялікім поспехам шукаць сваіх кліентаў.

## ТРОХПАКАЁВЫЯ — 300 ПЛЮС

Гэтыя шматпакаёвыя кватэры заўсёды мелі невялікі попыт. Кліентам на такое жыллё павінна быць дастаткова вялікая сям'я, бізнесмен сярэдняй рукі або статусны чыноўнік. Вялікая сям'я здымае кватэру, калі будуе новую. Такіх няшмат, але яны ёсць.

Падчас пандэміі ў Мінску значна скарацілася колькасць кавярняў, рэстаранаў і іншых арганізацый грамадскага харчавання. У апошні час са сталіцы едуць цэлымі сем'ямі людзі, якія раздлічвалі «заваявацъ» Мінск, а для гэтага старанна працавалі ў сферы абслугоўвання. Яны мелі дастаткова прыстойныя даходы. Цяпер іх стала менш.

Таму трохпакаёвыя кватэры прапануюцца па цане крыху больш чым за 300 долараў. У агульным каталогу арэндных кватэр я адшукаў усяго шэсць аб'ектаў па цане каля 270 да 300 долараў. Ды і то гэтыя варыянты былі занадта слабенькія, каб разлічваць на самавітага кліента.

Сярэдні цэннік гэтага жылля знаходзіцца ў дыяпазоне ад 330 да 360 долараў.

Што датычыцца варыянтаў VIP-узроўню, то там усё ў рэжыме чакання. Паколькі попыт на гэтыя кватэры фарміраваўся ў асноўным замежнымі кліентамі, то сёння яго фактычна няма.

## ДАГАВОР — І, ПАЖАДАНА, НА НЕКАЛЬКІ ГАДОЎ

Сярод новых нюансаў у сферы арэнды — патрабаванні кватарантаў, каб у іх здымнай кватэры быў абавязкова нехта прапісаны (зарэгістраваны), а таксама каб з уласнікам кватэры быў заключаны афіцыйны дагавор у ЖЭСе. Гэтыя патрабаванні цалкам зразумелыя, бо ў кватэры, дзе ніхто не зарэгістраваны, «жыроўка» за ацяпленне зімой можа дасягаць шалёных лічбаў. Заключэнне дагавора (дзе агучаны памер аплаты) у час амаль мінімальных цэннікаў на арэнду дадае кватаранту ўпэўненасці, што ўжо заўтра тарыф арэнды гаспадар кватэры істотна не павялічыць.

Цяпер змянілася і стаўленне ўласнікаў жылля да сваіх патэнцыйных кватарантаў. Калі раней гаспадары даволі скрупулёзна выбіралі сабе пастаяльцаў, то сёння іх палітыка на гэты конт стала больш гнуткая. У большасці выпадкаў адсутнічае катэгарычнае табу на сем'і з малымі дзецьмі, кампанію з двух-трох студэнтаў, а таксама на аматараў кошак і сабак. Гаспадары зусім не супраць свойскіх жывёл, але пры наяўнасці ў кватэры дарагіх шпалер яны могуць запатрабаваць у кватарантаў пакінуць пэўную суму задатку на выпадак псавання маёмасці. Звычайна памер такога задатку складае цану месячнай арэнды жылля або палову ад такой стаўкі. У гэтым выпадку спецыялісты рынку арэнды раяць патэнцыйным кватарантам загадзя агаворваць падобныя нюансы з уласнікамі жылля, пажадана, фіксаваць такія дэталі ў дагаворы.

## ЗНІЖЭННЕ МАГЧЫМАЕ І ЗІМОЙ

Больш за тое, цяпер спецыялісты адзначаюць, што менавіта гэтай зімой на рынку будзе назірацца павольная тэндэнцыя па далейшым патаненні сярэдніх па якасці кватэр, стаўкі па якіх раней былі вышэй, чым у бюджэтным сектары жылля. Гэта не імгненнае патанненне, а, хутчэй, карэкціроўка цэннікаў. Так, спачатку гаспадар утульнага жылля выстаўляе яго ў агульным каталогу па адной цане, але праз два-тры тыдні (калі кватэрай ніхто не цікавіцца) уласнікі ўжо згаджаюцца на зніжку ў памеры 20—40 долараў ад першапачатковай цаны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

**БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫЯ**

### Танны і якасны аб'ект — толькі ў пастцы

Ужо вядомы ў банкаўскай сферы фішынг дабраўся і да аперацый з нерухомасцю. А першай пацярпелай аказалася дзяўчына, якая трапіла ў рукі ашуканцаў, жадаючы арандаваць жыллё.

Афіцыйны тэлеграм-канал Следчага камітэта апублікаваў інфармацыю аб тым, што пры пошуку кватэры ў арэнду дзяўчына папала на грошы. Па даных следства, увечары 6 кастрычніка 22-гадовая дзяўчына ўбачыла на адной з папулярных гандлёвых інтэрнэт-пляцовак аб'яву аб здачы кватэры ў арэнду і напісала яго аўтару пра сваё жаданне арандаваць азначанае жыллё. Ёй адразу паведамілі, што ахвотных вельмі шмат і калі яна хоча займець ключы, то неабходна ўнесці перадаплату як мага хутчэй. Пасля чаго «арэндадаўца» прапанаваў перайсці па спасылцы і перавесці грашовыя сродкі.

А вось паказаная спасылка апынулася фішынгавай старонкай, вонкава падобнай да старонкі гандлёвай пляцоўкі, дзе пацярпелая ўвяла рэквізіты сваёй банкаўскай карты нібыта для ўнясення перадаплаты за арэнду кватэры. Пасля ўводу даных з яе карт-рахунку неадкладна спісалася больш за 500 рублёў. Па даным факце заведзена крымінальная справа (крадзеж шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі).

---

З нагоды

# Дзверы, адчыненыя да 20-годдзя

**Эканомія часу і грошай заказчыка, аптымальная лагістыка і гарантаваная своечасовая дастаўка. Усе гэтыя складнікі бездакорнага сэрвісу ўжо 20 гадоў аказвае Мінскі філіял РУП «Белмытсэрвіс». Да ўласнага юбілею прадпрыемства зрабіла падарунак усім датычным да мытнай справы — арганізавала Дзень адчыненых дзвярэй для кліентаў, партнёраў і студэнтаў факультэта «Мытная справа» БНТУ.**

Госці прайшліся па ўсім транспартна-лагістычным ланцужку арганізацыі і на свае вочы ўбачылі, які шлях праходзіць прадукцыя ад маркіроўкі і ўпакоўкі да пагрузкі ў кантэйнер з дапамогай адмысловага пагрузчыка рычстакера і адпраўкі спажыўцу. А прадстаўнікі БНТУ, які сёлета адзначае 100-гадовы юбілей, перадалі сімвалічны факел з агнём **Аляксандру СКАЧКОЎСКАМУ, дырэктару Мінскага філіяла РУП «Белмытсэрвіс»** як сімвал існуючага і будучага супрацоўніцтва.

— Сёння ў лагістычным кірунку самае значнае — кваліфікацыя супрацоўнікаў. Адзін чалавек можа суправаджаць цэлыя кантэйнеры, караблі і самалёты з грузамі. Сёння спецыялісты маюць найвышэйшую кваліфікацыю, дзякуючы ВНУ, практыцы і рабоце на знешніх рынках, і яны могуць у далейшым прынесці ноў-хаў у бізнес-працэсы, — падкрэсліў важнасць сустрэчы з навучэнцамі дырэктар.



Філіял «Белмытсэрвіса» займаецца перавозкамі грузаў любой формы і габарытаў па чыгунцы, на аўто, караблях, а не так даўно яны атрымалі і сертыфікат авіяцыйнага агента краіны і цяпер могуць «пад ключ» арганізаваць дастаўку цэлага авіяборта, ячэйкі ці кантэйнера ў краіны Еўрапейскага саюза і Кітай.

Толькі сёлета мінскі філіял апрацаваў больш за 20 тысяч кантэйнераў па імпарт. Умовы захоўвання грузаў у транспартна-лагістычных цэнтрах Мінскага філіяла могуць задаволіць патрабаванні да ўсіх відаў прадукцыі, неабходны мікраклімат забяспечваецца з дапамогай кандыцыянера і вялізных халадзільнікаў на ТЛЦ «Мінск-Белмытсэрвіс-2».

Цягам 20 гадоў прадпрыемства дыверсіфікуе свае паслугі і сёння з'яўляецца ўпаўнаважаным эканамічным аператарам, мытным прадстаўніком, мытным перавозчыкам, найбуйнейшым экспедытарам грузаў, спецімпарцёрам і рэалізатарам прадукцыі праз сетку ўласных крам.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

---

# У «БЧ. Мой цягнік» — 150 тысяч карыстальнікаў

**Электронныя сэрвісы Беларускай чыгункі запатрабаваныя ў пасажыраў і з кожным месяцам іх папулярнасць расце. Са снежня 2019 года карыстальнікам даступная бясплатная мабільная праграма «БЧ. Мой цягнік» і абноўлены раздзел «Паслугі пасажырам» на сайце БЧ (pass.rw.by). Мабільная праграма «БЧ. Мой цягнік» на свае прылады ўстанавілі ўжо 150 тысяч чалавек, паведамляе прэс-цэнтр магістралі.**

У верасні гэтага года праз мабільную праграму і адпаведны раздзел на сайце было аформлена звыш 35 працэнтаў білетаў на цягнікі з нумараванымі месцамі.

Пры гэтым папулярнасць набірае купля электронных білетаў на цягнікі з ненумараванымі месцамі. Гэты канал продажаў, адкрыты менш чым год таму, мае добрую дынаміку росту. Так, у верасні гэтага года з выкарыстаннем мабільнай праграмы «БЧ. Мой цягнік» і раздзела «Паслугі пасажырам» актываваны звыш 57,3 тысячы білетаў на цягнікі з ненумараванымі месцамі, што на 20 працэнтаў больш, чым у папярэднім месяцы. Усяго з пачатку 2020 года на цягнікі з ненумараванымі месцамі аформлена каля 360 тысяч электронных білетаў.

Як паказвае практыка, пасажыры цягнікоў з ненумараванымі месцамі — гарадскіх ліній і рэгіянальных ліній эканом-класа — аддаюць перавагу афармленню сваіх праязных дакументаў з дапамогай мабільнай праграмы «БЧ. Мой цягнік». Зручны інтэрфейс праграмы, магчымасць выбіраць маршруты, лёгкае пераключэнне паміж раскладам і анлайн-табло — усё гэта дазваляе аформіць білет на цягнік літаральна па дарозе на вакзал ці актываваць загадзя аплачаны білет непасрэдна перад адпраўленнем электра- або дызель-цягніка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Ловіцца рыбка вялікая і малая

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вось і з'явілася новае слова — фішынг, якое з англійскай перакладаюць як рыбная лоўля. Зламыснікі расстаўляюць сеткі, і найбольш даверлівы трапляецца. Бо такое «вывуджванне» грошай, калі злодзей звязваецца з ахвярай па тэлефоне, часам прысылае СМС і ўгаворвае назваць даныя банкаўскай карткі, становіцца вынікам прымянення інфармацыйных тэхналогій у справе падману. Кібермахляр дзейнічае нахабна і перакanaўча: прадстаўляецца, як правіла, супрацоўнікам банка альбо нейкага дзяржаўнага органа. І ў кожным з такіх выпадкаў ахвяра трапляецца на вудачку махляра добраахвотна, бо паведамляе канфідэнцыяльную інфармацыю прайдзісвету, які тэлефануе невядома адкуль.

Як паведамілі ў УСК па Брэсцкай вобласці, сума матэрыяльнага ўрону, нанесенага трымальнікам банкаўскіх карт праз супрацьпраўныя дзеянні, за дзевяць месяцаў гэтага года склала ў рэгіёне больш за 200 тысяч рублёў. Напрыклад, толькі за адзін дзень жніўня грошы скралі з рахункаў 15 жыхароў Брэстчыны.

З году ў год колькасць падобных злачынстваў расце. Як адзначаюць следчыя, у 2017—2019 гадах да банкаўскіх карт патэнцыяльных ахвяр зламыснікі пракладалі шлях найбольш праз сацыяльныя сеткі. Спачатку перапісваліся з карыстальнікамі ў раздзеле «Сябры», заваёўвалі прыязнасць і давер, ну а потым значна лягчэй было выманіць рэквізіты карткі.


polese.by

### ФАЛЬШЫВЫЯ ВЭБ-СТАРОНКІ

Але ў 2020 годзе колькасць такіх крадзяжоў пайшла на спад. Яно і зразумела, інфармацыйныя тэхналогіі ўвесь час удасканальваюцца, выходзяць на новы ўзровень, і кібермахляры не адстаюць. Цяпер яны сталі праяўляць актыўнасць з дапамогай фішынгавых вэб-старонак. Яны нярэдка ствараюць вэб-старонку, якая вельмі падобная на афіцыйны сайт вядомага сервісу альбо гандлёвай пляцоўкі. Апошнія ўтрымліваюць формы ўводу рэквізітаў, якія дазваляюць ажыццявіць доступ да банкаўскага рахунку. Новую фішынгавую веб-старонку размяшчаюць на спецыяльна створаным сайце, імя якога падобнае да імя афіцыйнага рэсурсу. Назва можа адрозніваца нават на адну літару. Пасля гэтага яны знаходзяць аб'яву, напрыклад, аб продажы якога-небудзь тавару на гандлёвых пляцоўках або ў інтэрнэце, і тэлефануюць аўтару аб'явы ці спісваюцца з ім. Чалавеку, які нічога не падазрае, прапануюць перайсці па гіперспасылцы на фішынгавую старонку і ўвесці даныя для атрымання грошай на картку, якія ўжо пералічаны за тавар. Ён дзейнічае па інструкцыі, называе даныя карткі, але замест атрымання грошай сам пазбаўляецца ўсяго, што мае на карт-рахунку. **Афіцыйны прадстаўнік УСК па Брэсцкай вобласці Дзмітрый ІВАНЮК** прыводзіць прыклады падобных крымінальных спраў. У канцы жніўня на падобную фішынгавую старонку заманілі 31-гадовую жыхарку Баранавічаў. Дзейнічалі па прыведзенай вышэй схеме. Як толькі жанчына ўказала рэквізіты сваёй карткі, з рахунка зніклі 450 рублёў. Праз месяц на «вудачку» зламыснікаў трапіла 36-гадовая жыхарка Камянца. У яе скралі 240 рублёў.

### МЕТАДАМ САЦЫЯЛЬНАЙ ІНЖЫНЕРЫІ

— А вось аферы ад імя супрацоўнікаў банка кібермахляры працягваюць ажыццяўляць даволі паспяхова, — адзначае **начальнік аддзела па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій Брэсцкага абласнога УУС Аляксандр РЫНГЕВІЧ.** — Актыўнічаць пад выглядам супрацоўнікаў банкаў яны пачалі яшчэ восенню мінулага года. І, нягледзячы на вялікія прафілактычныя меры, інфармаванне насельніцтва, метад дзейнічае. Спецыялісты называюць яго метадам сацыяльнай інжынеры. Стары псіхалагічны прыём: чалавеку тэлефануюць, ставяць ва ўмовы, калі трэба адразу прымаць рашэнне. Чалавек нярэдка губляецца і трапляе ў пастку. Гэта няспешна чытаючы падобную інфармацыю, можна разважаць, як не трэба быць даверлівым, як варта думаць і супастаўляць. А там чалавека застаюць у любой сітуацыі, скажам, у яго праблемы ў сям'і, нешта са здароўем, яшчэ нейкія крытычныя абставіны. Раптам табе тэлефануюць і адразу ўводзяць у стан павышанага стрэсу: цвёрдым, упэўненым голасам паведамляюць, што з карткі спрабуюць скрасці грошы. Да таго ж маніпулятары не пакідаюць час на роздум: маўляў, аперацыю трэба правесці тут і цяпер, мы яе пакуль прыпынілі, але трэба прымаць рашэнне неадкладна. Фішка заключаецца ў тым, каб не даць чалавеку апомніцца, не адпусціць яго, не даць яму час падумаць альбо параіцца. А калі пры гэтым у прайдзісветаў ёсць хоць нейкая інфармацыя пра карыстальніка, гэта надае праўдападобнасці і спрацоўвае. Абанент, як той казаў, гатовы. Пасля гэтага ім застаецца ўдакладніць рэквізіты. Яны звычайна гавораць: дастаньце картку, зверым даныя, нумар карты, тэрмін дзеяння, CVV-код. Гэтых даных ім хапае, каб правесці спісанне сродкаў.

**«Маніпулятары не пакідаюць час на роздум: маўляў, аперацыю трэба правесці тут і цяпер, мы яе пакуль прыпынілі, але трэба прымаць рашэнне неадкладна».**

Аляксандр Рынгевіч раіць людзям, якія атрымалі падобны званок, не панікаваць. І самае разумнае ў падобным выпадку — націснуць на кнопку, скінуць званок. На кожнай плацежнай карце са зваротнага боку напісаны тэлефон кругласутачнай службы вашага банка, якая дапаможа ў такіх сітуацыях. Калі вы патэлефануеце, супрацоўнік банка ўдакладніць па камп'ютарнай базе, ці ёсць такі карыстальнік, папытае, як вас завуць. Потым скажа, што з вашым рахункам усё ў парадку, ніхто на яго не пасягае. Вас могуць папрасіць назваць прозвішча, імя, нумар карты. Але для здзяйснення аперацый гэтага недастаткова, і да таго ж вы будзеце ўпэўненыя, што дакладна размаўляеце з супрацоўнікам банка.

Але што гаварыць пра высокія тэхналогіі, псіхалагічныя прыёмы, калі нашы людзі часам праяўляюць дзіўную неабачлівасць у дачыненні да ўласных плацежных картак? Здаецца, усе ведаюць, што пін-код паведамляць нікому нельга. І што мы бачым на прыкладзе звычайных маладых брастаўчан, якія жывуць на адной вуліцы, у адным двары? Дык вось адзін з іх папрасіў другога пазычыць 30 рублёў. Нібыта звычайная справа, па-суседску можна і пазычыць. Але ў другога ў кішэні не аказалася патрэбнай сумы, і ён перадаў знаёмаму картку, паведаміўшы пін-код у спадзяванні, што той здыме ўказаную суму, а картку прынясе гаспадару. Але 37-гадовы мужчына, узяўшы чужую картку, адразу накіраваўся ў забаўляльныя ўстановы, дзе з размахам правёў вечар на 870 рублёў. Міжраённы СК зараз расследуе крымінальную справу з гэтай нагоды, а следчыя зноў паўтараюць нібыта і банальныя рэчы: не паведамляйце пін-коды ад картак! Кажучы словамі Астапа Бендэра, самі ж аддаяце ключы ад кватэры, дзе ляжаць грошы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Крымінал

## СКРАЎ ТОНУ ЧЫГУННЫХ ВЫРАБАЎ

**19-гадовы хлопец працуе заатэхнікам на адным з сельгаспрадпрыемстваў Зэльвенскага раёна і са сваімі прамымі абавязкамі спраўляецца. Але, як аказалася, гэты грамадзянін не супраць скрасці ў роднай гаспадаркі тое, што дрэнна ляжыць. Падрабязнасці паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

Гэтым летам арганізацыя пачала рэканструкцыю памяшкання адкормачнага комплексу, падчас яе праводзіўся дэмантаж чыгунных рашотак. На іх і звярнуў увагу падазраваны. За два дні ён змог вынесці з тэрыторыі прадпрыемства 1200 кілаграмаў рашотак агульным коштам 450 рублёў. У далейшым малады чалавек планаваў здаць їх выкрадзенае ў пункт прыёму металу. Распачата крымінальная справа па артыкуле «Крадзеж».

Дарэчы, у ходзе праверкі сельгасарганізацый да гэтага прадпрыемства былі пытанні па маючаму месца доступу старонніх людзей на тэрыторыю і пашкоджанню агароджы. У прыватнасці, у ходзе ліпеньскай праверкі ў зарасніках каля склада было выяўлена падрыхтаванае да крадзяжу збожжа.



**Фота з сайта УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

## Камбікорм праз пралом

**Аператыўныя супрацоўнікі ўстанавілі двух жыхароў Кобрынскага раёна, якія ўначы спрабавалі скрасці з тэрыторыі прадпрыемства больш за 240 кілаграмаў камбікорму.**

Зламыснікі разабралі цагляны мур і пранiклі ўнутр памяшкання, дзе захоўваўся камбікорм. Першы дзірку ў сцяне заўважыў вартаўнік, які выклікаў міліцыю. Затым ён разам з іншым работнікам арганізацыі праверылі памяшканне склада, дзе і выявілі староннiх.

Прыбылыя на месца здарэння аператыўнікі ўстанавілі, што да злачынства датычныя двое вяскоўцаў: 54-гадовы рабочы прадпрыемства і яго 61-гадовы напарнік-пенсіянер.

Як паведамілі ў АБЭЗ Кобрынскага РАУС, побач з 54-гадовым фігурантам стаялі сем напоўненых камбікормам мяшкоў. Мужчына быў п'яны. Яго знаёмаму ўдалося збегчы. Высветлілася, што ў тую ноч хаўруснікі планавалі павезці на роварах адзінаццаць мяшкоў камбікорму. Чатыры не паспелі напоўніць.

Уцякач быў затрыманы на наступны дзень. Аказалася, што страх перад немінучай адказнасцю за ўчыненае ён прыглушаў алкаголем увесь гэты час і нават начаваў у полі, паведамляе УУС Брэсцкага аблвыканкама. У ходзе гутаркі з праваахоўнікамі мужчыны сваю віну прызналі цалкам.

## «АБЧЫСЦІЎ» РОДНУЮ БАБУЛЮ

**Падрабязнасці гісторыі паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама.**

Два жыхары Полацка прыйшлі дапамагаць пенсіянерцы, а ў выніку спусцілі ўсе яе зберажэнні на забавы. 30-гадовы мужчына з райцэнтра ў кампаніі свайго 20-гадовага знаёмага некалькі разоў наведваўся да роднай (!) бабулі. Нечаканая ўвага ад унука пажылой жанчыне вельмі падабалася, пакуль аднойчы яна не ўзялася за пералік сваіх зберажэнняў. Схованка, дзе раней была наяўнасць, аказалася абсалютна пустой... Зламыснікі знеслі больш за дзесяць тысяч рублёў.

Аператыўнікі Полацкага РАУС хутка ўстанавілі, хто «абчысціў» 84-гадовую пенсіянерку. Высветлілі яны і тое, куды сышлі яе грошы. Аказалася, што ўнук з прыяцелем гулялі на іх у мясцовых забаўляльных установах, а таксама купілі сабе новыя мабільныя тэлефоны.

Калі пацярпелая хапілася сваіх грошай, унук і яго прыяцель ужо паспелі спусціць усё скрадзенае. У дачыненні да падазраваных распачата крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| Продавец | **Копыльское районное потребительское общество, г. Копыль, пл. Ленина, 21** |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| Адрес ЭТП | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1**

Столовая (назначение: здание специализированное для общественного питания, об. пл. 532,3 кв. м, инв. № 642/С-27091, составные части: три пристройки, теневой навес).
Местоположение: **Минская обл., Копыльский р-н, Копыльский с/с, д. Дусаевщина, ул. Приозёрная, 11**

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0825 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 24.07.2031) для размещения объектов общественного питания (обслуживания здания столовой). Ограничения (обременения): водоохранная зона (р. Выня), ограничение прав в использовании земель по строительству, благоустройству и тому подобное (линия электропередач напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0136 га)

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 24 500,00 бел. руб.**

**Лот № 2**

Магазин (назначение: здание специализированное розничной торговли, об. пл. 146 кв. м, инв. № 642/С-11171, составные части: пристройка).
Местоположение: **Минская обл., Копыльский р-н, Тимковичский с/с, д. Степуры, ул. Несвижская, 24А**

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0810 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 15.09.2030) для строительства и обслуживания здания магазина. Ограничения (обременения): охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0119 га

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 5 500,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| Дата и время начала и окончания электронных торгов | **Начало торгов: 23.11.2020 в 11.00. Окончание торгов: 23.11.2020 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| Дата и время окончания приема заявок | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.11.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |
| Контактные телефоны | **+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор торгов | **ООО «ЛКВР» (УНП 692074939): г. Минск, ул. П. Бровки, д. 3, корп. 2, пом. 429, тел. 8 029 960 44 34, e-mail lkvr.torgi@by** |
| Продавец | **Индивидуальный предприниматель Коптик Александр Александрович (УНП 690861383) в лице антикризисного управляющего ЧПУП «Аналитик-центр», тел.: 8 017 284 05 66, 8 017 284 05 67** |
| Форма, дата, время и место и проведения торгов | **Открытые торги (аукцион) по продаже имущества 04.11.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 3/2, пом. 429** |

**Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним**

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена предмета торгов (без учета НДС), бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | - прицеп (специальный сортиментовоз МАЗ 8378, кузов Y3M83781030013393, 2011 года выпуска, бывшее в употреблении) | 3 960,00 |
| | Начальная цена лота № 1 снижена на 50 % от первоначальной стоимости. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 05.09.2020 | |
| 2 | - дебиторская задолженность ООО «Анфайстрой», УНП 191626949, в размере 6070,00 бел. руб. | 5 463,00 |
| 3 | - дебиторская задолженность ОАО «Залужье», УНП 600028774, в размере 2 885,38 бел. руб. | 2 596,84 |
| 4 | -дебиторская задолженность ЧПУП «Древайсбел», УНП 692094202, в размере 1 782,40 бел. руб. | 1 604,16 |
| 5 | -дебиторская задолженность ОАО «Положевичи», УНП 600028774, в размере 1 292,54 бел. руб. | 1 163,29 |
| 6 | - дебиторская задолженность ООО «СельХозПалет», УНП 600028774, в размере 3 865,60 бел. руб. | 3 479,04 |
| | Начальная цена лотов №№ 2, 3, 4, 5, 6 снижена на 10 % от первоначальной стоимости. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 05.09.2020 | |

| | |
|---|---|
| Место нахождения предмета торгов | г. Вилейка |
| Сроки и порядок приема заявок и зачисления задатка | **Для участия в торгах в срок по 03.11.2020 до 18.00 необходимо:** 1. перечислить задаток в размере 10 % от начальной цены предмета торгов на р/с BY09UNBS30122009110000000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, УНП 692074939, получатель – ООО «ЛКВР», назначение платежа: задаток 10 % по лоту № ____ (движимое имущество/дебиторская задолженность) индивидуального предпринимателя Коптика Александра Александровича, аукцион 04.11.2020; 2. подать заявление на участие и необходимые документы по адресу: г. Минск, 220041, а/я 10 либо на эл. почту **lkvr.torgi@tut.by. Тел.: (8029) 960-44-34** |
| Порядок проведения торгов | Шаг торгов – 5 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за один день до даты проведения. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 % от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона. Подробнее по телефонам: 8 029 960 44 34, 8017-360-14-79 |
| Порядок заключения договора и уплаты цены предмета торгов победителем торгов | Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 15 календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов |

## Информация о проведении открытого аукциона 24.11.2020 по продаже земельных участков для индивидуального строительства ПРОДАВЕЦ – ИВЕНЕЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| Лот | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) | Затраты на подготовку участка к аукциону (белорусских рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок в деревне Провжалы, площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер земельного участка 622084317601000106 Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеются в населенном пункте: подъездные пути, электричество, рядом лес | **2160** | **432** | **1288 руб. 69 коп.** + затраты за размещение сведений в СМИ |
| 2 | Земельный участок в деревне Провжалы, уч. № 71В, площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер земельного участка 622084317601000109 Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеются в населенном пункте: подъездные пути, электричество, рядом лес | **2160** | **432** | **1404 руб. 54 коп.** + затраты за размещение сведений в СМИ |

Аукцион состоится **24.11.2020** года (вторник) в 10.00 по адресу: г.п. Ивенец, площадь Свободы, д. 2, 2-й этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до **20.11.2020** года (включительно) до 17.00 по адресу: г. п. Ивенец, площадь Свободы, д. 2, кабинет управляющего делами исполкома. Время работы: понедельник–пятница с 8.00 до 17.00 с обеденным перерывом с 13.00 до 14.00. Вся информация размещена на сайте Воложинского райисполкома: www.volozin.gov.by.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь постоянно проживающим на территории Республики Беларусь в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 20 % от начальной цены участка перечисляется на расчетный счет госказначейства счет № BY94AKBB36006140305010000000 в ГУ МФ РБ по Минской области ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 600537220, Ивенецкий сельский исполнительный комитет. код платежа – 04901.

Для участия в аукционе организатору аукциона в срок, установленный в информационном сообщении о проведении аукциона, физические лица либо их представители представляют:

**заявление** на участие в аукционе по утверждаемой форме (представителями граждан — нотариально удостоверенная доверенность);

**квитанцию** об оплате задатка (оригинал).

При подаче заявления на участие в аукционе физические лица (представители физических лиц) предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его **копию!!!**.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня утверждения протокола.

222370, Ивенецкий сельский исполнительный комитет, Минская область, Воложинский район, г. п. Ивенец, площадь Свободы, д. 2, контактный телефон (8-01772) 53-388.

Расчетный счет № BY94AKBB36006140305010000000 в ГУ МФ РБ по Минской области ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 600537220, Ивенецкий сельский исполнительный комитет, код платежа – 04901.

## ЗАО «Евробанк» извещает о проведении торгов в электронной форме в виде открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ликвидируемому закрытому акционерному обществу «Евробанк» (далее – электронные торги)

Продавец – ЗАО «Евробанк» (УНП 807000148, юр. адрес: г. Минск, ул. Тимирязева, 129/5).

**Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке «Единая система электронных торгов» – www.torgi.gov.by.**

**02.11.2020 г. состоятся двенадцатые повторные электронные торги по совместной продаже следующего имущества ЗАО «Евробанк»:**

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС | Шаг торгов (5 %), бел. руб. | Сумма задатка (5 %), бел. руб. | Преимущества |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Капитальное строение с инв. № 500/С-35055, общая площадь 1432 кв. м, 4 этажа, расположенное на земельном участке площадью 0,1235 га с кад. ном. 500000000007006447, который находится на праве аренды по 31.01.2023 г., по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 129/5 | 912 000,00 | 45 600,00 | 45 600,00 | - пригодно для размещения банков и финансовых организаций;<br>- установлены дополнительные системы защиты от взлома;<br>- внутренняя и внешняя отделка здания;<br>- имеются все инженерные коммуникации;<br>- расположено в торговом комплексе «Ждановичи»;<br>- отличное транспортное сообщение;<br>- 630 м от МКАД;<br>- охраняемая территория с видеонаблюдением;<br>- парковочные места на территории |
| Лот № 2 | Секции и стойки ограждения, инв. № 491 | 5 692,76 | 284,64 | 284,64 | Секции и стойки ограждения расположены вокруг капитального строения с инв. № 500/С-35055 по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 129/5 |

Объявление о проведении предыдущих торгов по Лоту № 1 были размещены в газете «Звязда» от 10.01.2019 г., 21.02.2019 г., 23.03.2019 г., 11.05.2019 г., 19.06.2019 г., 11.07.2019 г., 18.09.2019 г., 15.11.2019 г., 11.01.2020 г., 25.02.2020 г. и 06.04.2020 г.

***Подробную информацию о реализуемом имуществе ЗАО «Евробанк», включая фотографии, можно получить на сайте:* www.torgi.gov.by.**

Также с имуществом, выставляемым на электронные торги, а также с документами можно ознакомиться по месту его нахождения, предварительно согласовав время по тел. +375291410101 (ликвидатор ЗАО «Евробанк» – Хвостович Сергей Валерьевич).

Для участия в электронных торгах **по Лотам № 1 и № 2 в срок по 02 ноября 2020 года** необходимо **зарегистрироваться на электронной торговой площадке «Единая система электронных торгов» – www.torgi.gov.by** и **сделать ставку** (при условии наличия на счете участника торгов, открытом на электронной площадке, достаточной суммы средств для внесения задатка) в размере 5 % от начальной цены имущества. Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5 % от начальной цены предмета аукциона.

Электронные торги проводятся в соответствии с Постановлением Советом Министров от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица».

Победителем электронных торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов производится победителем электронных торгов по фактическим затратам.

В случае если электронные торги признаны несостоявшимися, в силу того, что ставка сделана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

По результатам электронных торгов составляет протокол в двух экземплярах.

Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 5 дней с даты проведения электронных торгов.

Срок оплаты предмета торгов – 15 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Подробную информацию о порядке, условиях проведения электронных торгов, предмете торгов можно получить по тел. +37529 308 38 37 (Алена Александровна).

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Ивацевичдрев»

**Предмет торгов –** лот: капитальное строение с инвентарным номером 122/С-15464 (наименование: столовая; назначение: здание специализированное для общественного питания), площадью 221,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Гойшика, д. 33, на земельном участке с кадастровым номером 123450100001003706 площадью 0,1910 га.
Составные части и принадлежности: основная пристройка

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | 65 200,00 | **Размер задатка, руб.** | 6 520,00 |

**Продавец:** ОАО «Ивацевичдрев», 225295, Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2.
**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
**Р/с для перечисления задатка:** BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245.
**Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
**Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи.
**Условия продажи:** без условий.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона.
**Шаг аукциона:** 15 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 03 ноября 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 02 ноября 2020 г. до 17.00**

Ранее извещение о продаже имущества ОАО «Ивацевичдрев» было опубликовано в газете «Звязда» от 18.08.2020.

# Краіна здароўя

**Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.**
**Тэл.** (017) 311-17-36.

Тэхналогіі для здароўя

## Супраць раку, гепатыту, рассеянага склерозу і COVID-19

### Над чым працуюць беларускія фармацэўты і мікрабіёлагі

**Айчынныя фармацэўтычныя прадпрыемствы вырабляюць самыя розныя лекавыя прэпараты, у тым ліку супрацьпухлінныя, для лячэння сардэчна-сасудзістай сістэмы і страўнікава-кішачнага тракта, а таксама для пацыентаў з не самымі распаўсюджанымі, але вельмі цяжкімі хваробамі — такімі, як рассеяны склероз. Пры гэтым вытворцы ўпэўнены, што беларускія аналагі нічым не горшыя за замежныя арыгіналы, тым больш што патрабаванні да іх якасці вельмі жорсткія.**

Адным з вытворцаў высокатэхналагічных супрацьпухлінных прэпаратаў з'яўляецца Інстытут біяарганічнай хіміі НАН Беларусі. Тут асвоілі выпуск дарагіх прэпаратаў, якія патрабуюцца для беларускіх пацыентаў у невялікай колькасці — да 120 кілаграмаў у год. Пры гэтым кошт аднаго флакона замежнага прэпарату можа даходзіць да некалькіх соцень долараў.

— Мы стараемся выбіраць для выпуску дарагія лекавыя сродкі, каб забяспечыць імпартазамяшчэнне і разгрузіць бюджэт, — расказвае **дырэктар Інстытута біяарганічнай хіміі Святлана БАБІЦКАЯ.** — Усе гэтыя прэпараты выкарыстоўваюцца ў шпітальным сектары, і пацыенты іх атрымліваюць бясплатна, бо закупляе дзяржава.

Заканчваецца распрацоўка тэхналогіі вытворчасці і двух таргетных (малекулярна-накіраваных, якія «б'юць» па пэўных мішэнях) прэпаратаў для лячэння пячоначна-клетачнага і ныркава-клетачнага раку, а таксама хранічнага міелалейкозу.

А арыгінальны лекавы сродак гэтага вытворцы «Лейкавір» прызначаны для лячэння пацыентаў з рассеяным склерозам — ён спыняе разбурэнне запаленых участкаў галаўнога мозга. Гэты прэпарат, дарэчы, летась атрымаў залаты медаль на выстаўцы інавацый у Санкт-Пецярбургу.

Інстытут фізіка-арганічнай хіміі НАН Беларусі вырабляе лекавыя сродкі на аснове амінакіслот, якія добра засвойваюцца і не маюць істотных пабочных эфектаў. Адзін з іх — «Інакардзіл» — па антыішэмічным і кардыятропным дзеянні не саступае вядомаму «Прэдукталу». Прадпрыемства «Акадэмфарм» вядзе распрацоўку вытворчасці прэпаратаў супраць ВІЧ і гепатыту.

Калі ў 2010 годзе айчынныя прэпараты на беларускім рынку займалі 22 % у вартасным выражэнні, то з 2015 года гэтая лічба перавышае 50 %. Прычым цана беларускіх аналагаў у 1,5-2 разы ніжэй за імпартныя. У Беларусі 38 фармвытворцаў. Найбольш значныя — «Белмедпрэпараты», барысаўскі і нясвіжскі заводы медыцынскіх прэпаратаў, «Мінскінтэркапс», «Экзон» і «НПЦ Лоціас» — аб'яднаны ў фармацэўтычны холдынг. На яго рахунку — каля 80 % вытворчасці і такі ж унёсак у экспарт. Прадаюцца беларускія лекі ў 35 краін свету. Па якасці яны не саступаюць імпартным аналагам.

— Нашы вытворцы закупляюць субстанцыі на тых жа заводах у Індыі і Кітаі, што і сусветна вядомая «Байер». На 90 % нашы заводы пераасншчаны і працуюць на сучасным абсталяванні. Калі выязджаем на выстаўкі ў Расію і Украіну, першае, што змятаецца з паліц, — нашы лекі, — кажа **дырэктар «НПЦ Лоціас» Уладзімір ГАПАНОВІЧ.**

Беларускія навукоўцы займаюцца і распрацоўкай прэпаратаў супраць COVID-19.

— Група біяінфарматыкаў прааналізавала базы даных і знайшла структуры, якія могуць стаць правобразам прэпарату, што будзе блакіраваць бялкі каранавіруса. Але каб прыступіць да яго сінтэзу, неабходна фінансаванне. Таму мяркуем, што выкананне гэтых работ пачнецца ў наступным годзе. Разлічваць на выхад такога прэпарату можна ў бліжэйшыя некалькі гадоў, — расказала Святлана Бабіцкая.

Урокі псіхалогіі

# ЯК ПРАВІЛЬНА СУПЕРАЖЫВАЦЬ БЛІЗКІМ,

## або Чаму не працуе звычайнае «Вазьмі сябе ў рукі!»

**Вельмі часта мы чуем ад родных і блізкіх: «Вазьмі сябе ў рукі!», «Не адчайвайся, не хвалюйся, не перажывай», «Твая праблема — гэта яшчэ нічога, а вось у мяне сітуацыя значна горш, і я ж не плачу! « Але звычайна чалавек, пачуўшы падобныя словы, адчувае раздражненне, злосць, адчай, разгубленасць, сум, ён абясцэньвае свае перажыванні, душачы і назапашваючы іх, ці адчувае крыўду і расчараванне ў чалавеку, які яго не разумее. Што такое падтрымка, навошта яна неабходная і як правільна яе аказваць, а таксама як устрымацца ад «прычынення дабра» і чаму гэта важна, расказала ўрач-псіхатэрапеўт УЗ «Гарадскі клінічны псіхіятрычны дыспансер Мінска» Іна ЦЕЛЕШ.**

***— Іна Валер'еўна, каму патрэбна падтрымка?***

— У падтрымцы звычайна маюць патрэбу ўсе жывыя людзі ў складаныя перыяды жыцця. Падтрымка — гэта прыняцце чалавека яго суразмоўцам, прызнанне яго асобаснай, чалавечай каштоўнасці і значнасці незалежна ад таго, якімі якасцямі ён валодае, хворы ён ці здаровы. Пры гэтым трэба разумець, што чалавек, які вам скардзіцца, па нейкіх прычынах не гатовы прадпрымаць дзеянні, накіраваныя на змену сітуацыі, або гэтых намаганняў недастаткова. Інакш бы ён не скардзіўся, а дзейнічаў. Але дзеянне павінна саспець, сфарміравацца, напоўніцца энергіяй, а да таго моманту ўсякаму яшчэ трэба справіцца з цяжкімі перажываннямі. Для гэтага і патрэбна эмацыянальная падтрымка.

***— Здаецца, у нашым грамадстве скардзіцца ўвогуле не прынята...***

— Гэта так, некаторыя нават лічаць падобнае непрыстойным. Гэта можа ўспрымацца як праява слабасці характару і ўразлівасці. Але мы жывыя людзі, і ў нас ва ўсіх здараюцца цяжкасці. Наша здаровая псіхіка імкнецца знізіць напружанне, выклікане стрэсам. І самы просты спосаб справіцца з перажываннямі — паскардзіцца камусьці. Так, у сваім «хворым месцы» мы сапраўды ўразлівыя, але давайце не блытаць прычыну і наступствы. Мы ўразлівыя не таму, што скардзімся, а таму, што сутыкнуліся з цяжкасцямі і болем. Жалячыся, мы агаляем свой боль перад іншымі. І трэба паклапаціцца, каб гэты іншы быў досыць чулы і мог аказаць эмацыянальную падтрымку. Так што скардзіцца карысна, але важна выбіраць падыходзячых людзей і абставіны для скаргі.

***— Чаго не трэба рабіць, калі выслухваеш скаргу?***

— Тлумачыць прычыны. Калі дзяўчыне, якая скардзіцца, што набрала пяць лішніх кілаграмаў, сказаць, што гэта адбылося таму, што яна есць на ноч салодкае, то яна, верагодна, разззлуецца, кінуўшы ў вас нешта цяжкае, або канчаткова засмуткуе. Яна і так гэта ведае! Часцей за ўсё людзі не маюць патрэбы ў тым, каб ім патлумачылі, у чым корань іх праблем і што яны робяць не так. Часцей за ўсё яны разумеюць прычыны, але ці не могуць прыняць сітуацыю, ці не гатовыя змяніць яе. Ды і само тлумачэнне вытокаў праблемы не з'яўляецца спосабам яе рашэння.

Аднак можна ўявіць сабе і такі варыянт развіцця падзей, калі чалавек прыходзіць і кажа: «Вось у мяне ёсць праблема, але я ўсё роўна не разумею, чаму гэта са мной адбываецца, ты можаш дапамагчы мне разабрацца?». Вось тады, калі ласка, шукайце, аналізуйце, мяркуеце. Але толькі не пераблытайце адчайнае «Чаму гэта са мной адбываецца!» з рэальнай гатоўнасцю разабрацца ў прычынах. У першым выпадку гэта скарга, і да яе трэба падыходзіць па-іншаму.

Не трэба і даваць парады. Хоць гэта звычайна першае, што прыходзіць многім людзям у галаву. І кіруюцца яны самымі добрымі намерамі. Шмат каму здаецца,



што парады і рэкамендацыі — гэта тая дапамога, якую яны могуць аказаць. Але, на жаль, парады, хутчэй за ўсё, будуць бессэнсоўныя. Альбо чалавек іх не пачуе, альбо адчуе сябе яшчэ горш ад таго, што не зможа іх выканаць, а, магчыма, нават раззлуецца на вас.

Па-першае, дарадчыкі часта забываюць, што мы ўсе вельмі розныя: у нас розная асабістая гісторыя і вопыт, розныя фізічныя магчымасці і абмежаванні, розныя перавагі і мэты ў жыцці. Раім мы заўсёды зыходзячы са свайго ўяўлення пра жыццё і памылкова думаючы, што іншыя людзі мала чым ад нас саміх адрозніваюцца. Але гэта не так.

Па-другое, скарга мае месца, калі дзеянне па нейкай прычыне немагчымае. З прычыны ці абставінаў, ці проста таму, што яго час яшчэ не прыйшоў, чалавек не даспеў да таго, каб змяніць сітуацыю або ён проста не здольны. А, можа быць, яго дзеянні аказаліся не такія паспяховыя, як хацелася б.

Але калі чалавек наўпрост пытаецца падказкі, калі не ведае, што рабіць у сітуацыі, якая склалася, — райце на здароўе. Хоць, зноў жа, не прымайце за просьбу даць параду эмацыянальны выкрык накшталт: «Ну што ж мне рабіць!». Пераканайцеся, што гэта было пытанне, перш, чым раіць.

***— Яшчэ адзін прыём тых, хто выслухоўвае, — параўнанне. Маўляў, твая праблема ў параўнанні з іншымі — дробязь...***

— І гэтага таксама трэба пазбягаць. Зразумела, мы ўсе ведаем, што «а ў Афрыцы дзеці галадаюць» і «а дзесьці ідзе вайна» і, напэўна, нашы сутыкненні, нечаканасці і няўдачы — дробязь ў параўнанні з пастаяннай барацьбой за жыццё. Але нагода для перажывання не заўсёды адпавядае яго інтэнсіўнасці. І тое, з-за чаго чалавеку дрэнна, можа кардынальна не вязацца з тым, як яму дрэнна. І тое, што для аднаго становіцца трагедыяй, для іншага — толькі ўкус камара. Успомніце, як плачуць дзеці з-за зламанай цацкі.

Параўнанне крыўднае яшчэ і таму, што яно вельмі блізкае да абясцэньвання. Жаданне падбадзёрыць чалавека, паказаўшы яму, што бываюць праблемы і горшыя, хутчэй за ўсё, будзе ўспрынята як няздольнасць пачуць, прыкмеціць важнае, падзяліць каштоўнасць вашага суразмоўцы.

Яшчэ важна не асуджаць. Трэба спыніць свае намеры расказаць, у чым вінаваты той, хто скардзіцца, і як ён сваімі рукамі стварыў гэтую цяжкую сітуацыю, з якой складана выбрацца, і як ён памыляецца ў сваіх спосабах справіцца з праблемай, збоку гэта ж лепш відаць.

***— Як тады правільна аказваць падтрымку?***

— Найперш — актыўна слухаць. Гэта праўда важна. Часам чалавеку проста неабходна быць пачутым. Адчуць, што ў яго бядзе побач з ім ёсць хто-небудзь іншы. Нездарма ходзяць легенды пра тое, як лёгка расказаць усё сваё жыццё выпадковаму спадарожніку. Доўга-доўга расказваць пра сябе, выкласці ўсе свае беды і сумневы, і каб цябе слухалі. Слухачу ж важна праяўляць знакі сваёй прысутнасці і шчырай цікавасці, падтрымліваць зрокавы і маўленчы кантакт, задаваць пытанні для ўдакладнення.

А таксама спачуваць. Гэта значыць, даць зразумець суразмоўніку, што вы ўяўляеце, як яму няпроста ў сітуацыі, якая склалася. Вядома, да канца зразумець вы гэтага не можаце, нават калі былі ў падобнай сітуацыі, бо гэта была іншая сітуацыя. Але, магчыма, вам таксама было няпроста, і вы знаходзіце ў душы ўнутраны водгук на скаргу. Дайце зваротную сувязь, падзяліцеся тым, што вас кранае сказанае вашым суразмоўнікам.

Часам нават простае «Эх, і праўда не пашанцавала» ці «Цяжка табе» можа аказацца тым сігналам, які чалавек успрыме як спачуванне, як тое, што яго не абясцэнілі і пацвердзілі яго права адчуваць, што ён адчувае, што ёсць побач нехта, каму ён не абыякавы.

Ну, і прапанаваць рэальную дапамогу. Калі ў вас ёсць такая магчымасць, вядома. Гэта можа быць дапамога грашыма, рэчамі ці тым, каб прыехаць і зрабіць нешта для іншага. Можа быць, вашай сяброўцы няма калі выйсці з хаты, каб вырашыць праблему, а вы можаце пасядзець з дзецьмі. Ці вы можаце прыехаць і дапамагчы ў прыборцы. Або з'ездзіць разам да ўрача, каб не было так страшна. Падумайце, што вы можаце зрабіць для іншага, калі вам сапраўды не ўсё роўна, што з ім адбываецца. Але перш чым гэта рабіць, не забудзьцеся спытаць, ці можа гэта быць карысна для вашага блізкага, ці хоча ён вашай дапамогі. Будзьце гатовыя да адмовы. Памятайце, што не ўсе і не заўсёды гатовы прымаць нават самыя лепшыя прапановы аб дапамозе.

Выступаць у ролі чалавека, які падтрымлівае, сапраўды цяжкая праца, большая частка якой заключаецца ў тым, каб утрымаць сябе ад «прычынення дабра» іншаму. Мы звычайна робім гэта з прычыны ўласнай трывогі, разгубленасці перад чужой бядой і сваёй уразлівасці. Важна заставацца ў гэтых пачуццях самім сабой, а не спрабаваць кампенсаваць свой асабісты дыскамфорт за кошт уладкавання жыцця іншага чалавека.

Сумесны выпуск газеты «Звязда»
і Міністэрства прыродных рэсурсаў
і аховы навакольнага асяроддзя
№ 6 (52)

Грамадская ініцыятыва

# Экалагічны бізнес стварае будучыню

**Мінулым летам у краіне стартаваў рэспубліканскі конкурс найлепшых бізнес-ідэй у галіне экалогіі «Belarus Green Awards 2020». Яго місіяй стаў пошук рашэнняў экалагічных праблем праз інавацыйныя праекты.**



З 58 прынятых анкет з усёй Беларусі ў паўфінал выйшлі 12 удзельнікаў. Народнае галасаванне, у якім узяло ўдзел больш за 7000 чалавек, вызначыла сем фіналістаў.

— Колькасць удзельнікаў конкурсу і народнага галасавання сведчыць аб тым, наколькі актуальная тэма аховы навакольнага асяроддзя, «зялёнай», цыркулярнай эканомікі, экалагічнай бяспекі, — адзначыў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК.** — Я вельмі рады, што сёння грамадскасць так турбуе гэта тэма. Таму што самае важнае ў нашым жыцці — здаровае навакольнае асяроддзе. Будзе яно — будзе здаровая нацыя, будзе эканоміка і будзе квітнець наша родная Беларусь.

Якія ж праекты на думку журы сталі найлепшымі?

## ДАПАМАГЧЫ ПРЫРОДЗЕ І ПАСЁЛКУ

Першае месца ў конкурсе заняў праект «ZNOVA» (г. п. Зэльва, Гродзенская вобласць). Гэта школьная бізнес-кампанія Зэльвенскай сярэдняй школы № 2 па вытворчасці паперы з трысняга. Па словах яго кіраўніка, настаўніцы хіміі Наталлі ГРОМ, праект дапамагае паменшыць выкарыстанне пластыку, замарудзіць працэс знікнення лясоў і вырашыць праблему зарастання вадаёмаў.

З трысняга можна вырабляць паперу для экапакетаў і кардонных скрынак, а таксама для дэкаратыўнай творчасці і сувенірнай прадукцыі. Такую паперу лёгка перапрацоўваць і выкарыстоўваць без дадатковых выдаткаў і шкоды для наваколля.

— Мы гадуем юных бізнесменаў, якія робяць упор на экалогію, — расказала Наталля Гром. — Наша мэтавая аўдыторыя — рамеснікі, мастакі, свядомыя спажыўцы.

Канчатковая ж мэта — запусціць вытворчасць экаўпакоўкі з трысняговай паперы. Гэта не толькі дапаможа рашэнню экалагічных праблем, але і створыць дадатковыя рабочыя месцы ў пасёлку.

**Арганізатарамі конкурсу выступілі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, праект здаровага спосабу жыцця і «зялёнага» спажывання «Пастарнак» і нацыянальны выставачны цэнтр «БелЭкспа».**

## АГАРОД У ЦЭНТРЫ ГОРАДА

«Серабро» конкурсу атрымала «Сіціферма Ogorod» (Мінск). На першай гарадской ферме вырошчваецца мікразеляніна — маленькія парасткі агародніннных і салатных культур, вострых траў. Яе выкарыстоўваюць у рэстаранах і кафэ, прадаюць у прадуктовых крамах, ужываюць для дэкору страў.

Па словах прадстаўніка праекта Кацярыны МІРОНАВАЙ, вертыкальныя фермы становяцца ўсё больш папулярныя ў свеце, да таго ж яны дапамагаюць вырашыць праблему харчавання. З-за перанаселення Зямлі, змены клімату, росту плошчы гарадоў і дэградацыі зямель у найбліжэйшыя дзесяцігоддзі колькасць ежы можа паменшыцца. Вертыкальныя ж фермы можна размяшчаць і ў гарадах, яны не патрабуюць значнай колькасці вады, на іх не выкарыстоўваюцца пестыцыды.

## «ЗЯЛЁНЫ» ДАКУМЕНТААБАРОТ

Трэцяе месца на конкурсе заняў IT-праект «ЕЗ» (Мінск) па стварэнні і развіцці экалагічнага электроннага дакументаабароту.

**Пераможцы конкурсу атрымалі ментарскую падтрымку і грашовыя прэміі, якія змогуць накіраваць на развіццё сваіх праектаў.**

Ён прызначаны дапамагчы спецыялістам у галіне аховы навакольнага асяроддзя скараціць працягласць выканання руцінных аперацый і павялічыць час на рашэнне важных экалагічных задач на прадпрыемстве.




Як расказала кіраўнік праекта, інжынер-эколаг Алеся ГАЦУРА, ключавая яго ідэя — стварэнне зручнай анлайн-праграмы на базе «воблачнай» платформы для збору і апрацоўкі экалагічнай інфармацыі. Гэта дазволіць аптымізаваць работу аддзелаў экалогіі на прадпрыемствах, скараціць працазатраты, выключыць падаванне няправільных даных у кантрольныя органы.

Праект «ЕЗ» уключае некалькі модуляў. Спецыялісты ўжо працуюць з модулем «ЕЗ паветра», затым плануецца падключыць «Вытворчыя адходы», «Водаадвядзенне і водакарыстанне», «Зялёныя насаджэнні» і «Агрэгаванне».

**Веранікa КОЛАСАВА.**

«Зялёная» эканоміка

# Ветракам расправіць крылы!

## Развіццё ветраэнергетыкі ў Беларусі эфектыўнае і эканамічна апраўданае



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Увод у эксплуатацыю БелАЭС не адмяняе здабычу энергіі з аднаўляльных крыніц. Гэтая тэма па-ранейшаму ў трэндзе. Бо недарагая і чыстая энергія — адна з мэт Парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года. Як развіваюцца ў нашай краіне альтэрнатыўныя крыніцы энергіі (АКЭ), расказала начальнік упраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра, змены клімату і экспертызы Мінпрыроды Наталля ГУЛЬНІЦКАЯ *(на фота)*.**



***— Чаму тэма атрымання энергіі з аднаўляльных крыніц, вобразна кажучы, не сыходзіць з першых старонак?***

— Для гэтага ёсць некалькі прычын. Пачнём з міжнародных абавязацельстваў нашай краіны. Беларусь далучылася да Рамачнай канвенцыі ААН аб змяненні клімату, Кіёцкага пратакола і Парыжскага пагаднення да яе. Мінпрыроды, з'яўляючыся органам, адказным за выкананне гэтых абавязацельстваў, падтрымлівае развіццё аднаўляльнай энергетыкі ў нашай краіне, бо яно спрыяе скарачэнню выкідаў парніковых газаў і забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, а ў выпадках атрымання энергіі з біягазу і розных відаў біямасы адначасова вырашаюцца пытанні ўтылізацыі адходаў.

Гэта пацвярджаецца лічбамі. Спальванне вуглевадародных відаў паліва суправаджаецца значным паступленнем у атмасфернае паветра парніковых газаў. З 92 млн тон парніковых газаў, выкінутых у 2018 годзе, 57 млн тон, або каля 62 %, прыпадаюць на энергетычны сектар, то-бок спальванне паліва стацыянарнымі і мабільнымі крыніцамі.

У агульным аб'ёме выкіду забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ад стацыянарных крыніц за 2019 год, які склаў 426,1 тыс. тон, выкіды ад спальвання паліва складаюць 85 тыс. тон, або 20 %.

Сонца і вецер — невычэрпныя прыродныя рэсурсы, а атрыманая з гэтых крыніц энергія — самая чыстая, бо ад яе няма ніякіх выкідаў у атмасфернае паветра: ні забруджвальных рэчываў, ні парніковых газаў. Такія віды энергіі прырода нам проста дорыць, за іх не трэба плаціць валютай, як у выпадку з вуглевадародным палівам.

***— Аднак жа часта кажуць пра тое, што наш клімат не вельмі падыходзіць для здабычы энергіі з АКЭ.***

— Гадавы прыход сонечнай радыяцыі на адзінку плошчы нашай краіны супастаўны з такім паказчыкам для Германіі, Польшчы і іншых краін Еўропы, дзе сонечная энергетыка развіваецца больш высокімі тэмпамі. А з улікам удасканалення тэхналогій развіццё ветраэнергетыкі ў Беларусі таксама эфектыўнае і эканамічна апраўданае.

***— Наталля Барысаўна, якія віды аднаўляльных крыніц энергіі ў нашай краіне выкарыстоўваюцца больш за ўсё?***

— У іх пераліку нічога не змянілася. Гэта драўнянае паліва, якое ў асноўным выкарыстоўваецца для вытворчасці цеплавой энергіі. Пашырэнне яго прымянення ў энергетычных мэтах павінна адбывацца за кошт комплекснага выкарыстання адходаў лесанарыхтоўкі і дрэваапрацоўкі. Найбольш эфектыўна можна выкарыстоўваць неліквідную драўніну, адходы лесанарыхтоўкі і дрэваапрацоўкі шляхам іх трансфармацыі ў шчэпкі ці пелеты.

Атрыманне энергіі пры спальванні розных відаў біямасы, напрыклад, адходаў дрэваапрацоўкі або раслінаводства, а таксама біягазу, што атрымліваецца з адходаў жывёлагадоўлі і раслінаводства, цукровай або спіртавой вытворчасці, камунальных адходаў, адходаў ачышчальных збудаванняў, дазваляе адначасова вырашыць пытанні ўтылізацыі арганічных адходаў. Відавочна, што наша краіна мае дастатковы патэнцыял для развіцця аднаўляльнай энергетыкі. Да таго ж эфектыўнае выкарыстанне аднаўляльных крыніц энергіі — гэта абавязковы складнік «зялёнай» эканомікі, адзін з кірункаў устойлівага развіцця любой дзяржавы.

***— Ці атрымліваюць праекты ў сферы развіцця выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі, што рэалізуюцца ў нашай краіне, міжнародную падтрымку ПРААН / ГЭФ?***

— Так, падтрымка ёсць. Напрыклад, праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Ліквідацыя бар'ераў для развіцця ветраэнергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь». Вынікам праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі ЕС з'яўляецца стварэнне і функцыянаванне на базе Рэспубліканскага цэнтра дзяржаўнай экалагічнай экспертызы і павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў Мінпрыроды сучаснай ветраэнергетычнай установкі магутнасцю 2,5 МВт паблізу населенага пункта Грабнікі Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці.

***— Калі Мінпрыроды выдала першы сертыфікат аб пацвярджэнні паходжання энергіі і колькі іх ужо ёсць?***

— З 2011 года да цяперашняга часу выдадзены 228 сертыфікатаў аб пацвярджэнні паходжання энергіі па 266 установках па выкарыстанні АКЭ, уключаючы пускавыя комплексы і чэргі будаўніцтва ўстановак, агульнай вызначанай магутнасцю больш за 390 МВт. Сёння відавочна, што доля энергіі, якая здабываецца з АКЭ, у агульным аб'ёме выпрацоўкі электраэнергіі ў краіне застаецца па-ранейшаму нязначнай. Гэта пры тым, што ёсць патэнцыял для яе нарошчвання.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

Слова — маладым

# Студэнты скараюць экалагічны Алімп

**Рэспубліканскі этап 10-й Міжнароднай экалагічнай алімпіяды ВНУ краін СНД прайшоў у Міжнародным дзяржаўным экалагічным інстытуце імя А. Д. Сахарава БДУ. Дзевяць камандаў з устаноў вышэйшай адукацыі спаборнічалі за права прадстаўляць сваю краіну ў фінале.**



У склад журы ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, БелНДЦ «Экалогія», Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства, а таксама кіраўнікі ўсіх камандаў.

— Традыцыйна алімпіяда праводзіцца ў форме тэарэтычнага і практычнага тураў, — паведаміў **намеснік дырэктара па вучэбнай і выхаваўчай рабоце МДЭІ імя А. Д. Сахарава Ігар БУЧАНКОЎ.** — Каб паспяхова выканаць тэарэтычныя заданні, студэнтам неабходныя глыбокія веды ў галінах экалагічнага і міжнароднага права, экалагічнай экспертызы і аўдыту, прамысловай экалогіі і экалагічнай бяспекі ў цэлым.

Тэма практычнага тура, абраная галасаваннем кіраўнікоў камандаў-удзельніц, надзвычай актуальная: «Вырашэнне праблем утылізацыі і перапрацоўкі адходаў вытворчасці».

Кожная каманда знайшла вялікую разнастайнасць падыходаў да акрэсленых праблем. Напрыклад, удзельнікі прапанавалі магчымыя кірункі выкарыстання ападкаў сцёкавых водаў і гальванічных шламаў, тэхналогіі абясшкоджвання адходаў горназдабыўной, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці, энергетыкі, машынабудавання, металургіі, а таксама праект ЭКАдома, будаўнічыя матэрыялы для якога выраблены з перапрацаваных адходаў.

— Узровень экалагічных ведаў студэнтаў за апошнія гады істотна павысіўся, — канстатуе Ігар Бучанкоў. — Часта адрыў паміж лідарамі складае ўсяго дзясятыя долі бала, што сведчыць аб дасканалай падрыхтоўцы і актыўным духу спаборніцтва.

Першае месца заняла каманда факультэта хімічнай тэхналогіі і тэхнікі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (кіраўнік — Людміла Шыбека).

На другім месцы — каманда біялагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (кіраўнік — Аксана Несцерава).

Трэцяе месца — у каманды факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (кіраўнік — Наталля Гагіна).

Журы вылучыла таксама пяць пераможцаў у індывідуальным заліку. Юнакі і дзяўчаты расказалі аб праектах, што абаранялі на алімпіядзе, назвалі экалагічныя праблемы, якія іх найбольш непакояць, і падзяліліся прафесійнымі планамі.

**Алег СЫМАНКОЎ, факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ (1-е месца):**




— Наша каманда працавала над праектам зборy і перапрацоўкі адходаў, якія змяшчаюць ртуць, у прыватнасці, лямпаў. Мы прапанавалі стварыць Тэлеграм-бот, у якім кожны чалавек зможа апісаць мадэль сваёй лямпы і даведацца, як правільна яе ўтылізаваць. У будучым мне хацелася б паспрабаваць сябе ў галіне дзяржаўнай экалагічнай экспертызы.

**Надзея ЛАЗЕРКА, біялагічны факультэт БДУ (2-е месца):**



— У камандным праекце мы прыдумалі адкрыць на месцы адпрацаванага калійнага радовішча асветніцкі Экапарк. На мой погляд, адсутнасць экалагічнай адукаванасці насельніцтва — галоўная сучасная праблема, з якой вынікаюць усе астатнія. Калі яе вырашыць, будзе значна лягчэй ахоўваць прыроду. Вучуся на біёлага-біятэхнолага, абрала кірунак «фізіялогія раслін», каб паляпшаць сарты сельскагаспадарчых культур.

**Арсеній ЦЕРАШКОВІЧ, факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ (3-е месца):**



— Я прапанаваў бы распрацаваць лямінесцэнтныя лямпы, праводзіць іх дэмеркурызацыю і паўторна выкарыстоўваць ртуць. Найбольш значнымі экалагічнымі праблемамі лічу змену клімату, забруджванне навакольнага асяроддзя мікрапластыкам і змяншэнне біяразнастайнасці. Планую выкладаць прыродазнаўчыя навукі і займацца мадэляваннем наступстваў кліматычных змен.

**Павел ЮХНЮК, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна (4-е месца):**



— Цікава было ўсім камандам вырашаць, што рабіць з адходамі шматпрофільнага сельгаспрадпрыемства, якія маюць розныя класы небяспекі. Напрыклад, мы абралі біятэхналагічны метад перапрацоўкі гною з дапамогай адмысловых бактэрый. Хачу стаць навукоўцам у галіне экагеаграфіі і геаэкалогіі, каб садзейнічаць захаванню нашай планеты праз кансенсус і супрацоўніцтва краін з супрацьлеглымі палітычнымі інтарэсамі.

**Ганна КУЛІНІЧ, факультэт геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ (5-е месца):**



— Мне здаецца, што найбольш вострыя экалагічныя праблемы — утварэнне шматлікіх адходаў і забруджванне паветра аўтамабілямі і прадпрыемствамі. Думаю пайсці ў магістратуру, а пасля працаваць у дзяржаўнай навуковай установе ў галіне экалагічнай экспертызы.

* * *

Фінал 10-й Міжнароднай экалагічнай алімпіяды адбудзецца 29 кастрычніка таксама на базе МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ. Ён пройдзе ў дыстанцыйным фармаце. Да ўдзелу запрошаны каманды ўсіх базавых устаноў дзяржаў СНД у галіне экалагічнай адукацыі. Беларусь прадставіць зборная каманда, сфарміраваная з пераможцаў у індывідуальным заліку.

**Святлана ІШЧАНКА.**

Дадатковая адукацыя

# Навучанне для пачаткоўцаў і павышэнне кваліфікацыі для вопытных

**Рэспубліканскі цэнтр дзяржаўнай экалагічнай экспертызы і павышэння кваліфікацыі Мінпрыроды запрашае на вочнае навучанне ў міні-групах. Тэматычныя семінары будуць арганізаваны ў анлайн-фармаце.**

«У сувязі з сітуацыяй, абумоўленай эпідэмічным становішчам, мы пільна сочым за мерамі сацыяльнага дыстанцыявання, — растлумачыў **намеснік дырэктара ўстановы па вучэбнай і навуковай рабоце Дзмітрый МЕЛЬНІЧЭНКА.** — Для арганізацыі найбольш эфектыўнага навучальнага працэсу мы набіраем у групы не больш за дзесяць чалавек. Цяпер яны будуць займацца ў самай вялікай аўдыторыі, разлічанай на 70 слухачоў. Натуральна, у памяшканні ўстаноўлены санітайзеры. У нас дзейнічае масачны рэжым».

Заяўкі на навучанне неабходна падаваць за 5-7 каляндарных дзён да пачатку заняткаў. Для слухачоў курсаў прапануецца жыллё ў гасцініцы навучальнага цэнтра «ЭкаДом», кошт пражывання за суткі — ад 36,50 рубля. Тут жа працуе кафэ «ЭкаПаўза», у будні абед каштуе ад пяці рублёў. Таксама ў вольны ад заняткаў час можна наведваць сучасную спартзалу. А калі адна арганізацыя адразу накіруе на курсы трох і больш чалавек, то для іх прадугледжана зніжэнне кошту навучання на 10 %.

| | | |
|---|---|---|
| | ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ | |
| 02.11 — 06.11 | Сучасны стан і праблемы абыходжання з адходамі вытворчасці ў медыцынскіх установах | 168,00 |
| 02.11 — 06.11 | Ахова працы (у тым ліку практычныя заняткі з выкарыстаннем праграмнага забеспячэння «Экзамен») | 115,00 |
| 09.11 — 13.11 | Пачынаючы эколаг. Дапамога спецыялісту ў галіне аховы навакольнага асяроддзя | 150,00 |
| 09.11 — 13.11 | Патрабаванні да выпрабавальных лабараторый, якія ажыццяўляюць адбор пробаў і правядзенне вымярэнняў у галіне аховы навакольнага асяроддзя | 150,00 |
| 09.11 — 13.11 | Забеспячэнне экалагічнай бяспекі пры арганізацыі і правядзенні тэхнічнага агляду транспартных сродкаў | 290,00 |
| 16.11 — 20.11 | Абыходжанне з адходамі вытворчасці: збор, захоўванне і захаванне, перавозка, выкарыстанне і абясшкоджванне | 150,00 |
| 16.11 — 20.11 | Ахова атмасфернага паветра і выкарыстанне праграмнага забеспячэння па разліках узроўню забруджвання | 230,00 |
| 16.11 — 20.11 | Сучасныя патрабаванні да ачысткі, абясшкоджвання і адвядзення сцёкавых вод. Заканадаўчыя патрабаванні да адвядзення паверхневых сцёкавых вод | 180,00 |
| 16.11 — 20.11 | Арганізацыя і ажыццяўленне гідраметэаралагічных назіранняў у сучасных умовах | 150,00 |
| 23.11 — 27.11 | Вытворчыя назіранні ў галіне аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў | 180,00 |
| 23.11 — 27.11 | Эксплуатацыя (абслугоўванне) і вядзенне дзяржаўнага ўліку меліярацыйных сістэм і асобна размешчаных гідратэхнічных збудаванняў | 230,00 |
| 30.11 — 04.12 | Правядзенне ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў частцы вады, нетраў, расліннага і жывёльнага свету, асабліва ахоўных прыродных тэрыторый, зямлі (уключаючы глебы) | 500,00 |
| 30.11 — 04.12 | Патрабаванні да выканання раздзелу «Ахова навакольнага асяроддзя» ў праектнай дакументацыі | 200,00 |
| 30.11 — 04.12 | Геалагічнае і маркшэйдарскае забеспячэнне адкрытых горных работ | 250,00 |
| 30.11 — 04.12 | Водазаборныя свідравіны: канструкцыя і эксплуатацыя. Патрабаванні да тэхабслугоўвання, рэканструкцыі і рамонту. Вядзенне ўліку вод. Разлік зоны санітарнай аховы (ЗСА) | 200,00 |
| | НАВУЧАЛЬНЫЯ КУРСЫ (СЕМІНАРЫ) | |
| 04.11 | Супрацьдзеянне карупцыі ва ўстановах і арганізацыях усіх форм уласнасці | 75,00 |
| 05.11 | Псіхалогія кіравання і вырашэнне канфліктаў | 84,00 |
| 05.11 | Патрабаванні ў галіне абыходжання з адходамі ў медыцынскіх установах | 84,00 |
| 11.11 | Парадак арганізацыі работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб | 84,00 |
| 12.11 | Правілы правядзення ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе (АУНА) | 84,00 |
| 12.11 | Патрабаванні да мабільных установак пры перапрацоўцы адходаў | 75,00 |
